Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 17 (3921)
НЯДЗЕЛЯ, 18 СТУДЗЕНЯ
1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Месячнік лесазагатовак—
важнейшая гаспадарча-палітычная кампанія

Задачы разгорнутага будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне, выкананьня пяцігодкі за чатыры гады ставяць на вдно з першых месц у народнай гаспадарцы лясную гаспадарку і лясную прамысловасьць.

Значэньне лясной гаспадаркі акрэсьліваецца хаця-б тым, што яна зьяўляецца валютным цэхам нашай краіны; корміць нашу будаўнічую, дрэваапрацоўчую, машынабудаўнічую, а часткова і апалаву гаспадарку, зьяўляецца крыніцай пескарэньня тэмпаў індустрыялізацыі нашай гаспадаркі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Пасьпяховае правядзеньне лесазагатовак дасьць магчымасьць партыі і ўсёй рабочай клясе хутчэй дабіцца далейшых рэвалюцыйных посьпехаў у справе гіганцкага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Лясная прамысловасьць Беларусі ў асобным квартале 1930 году павінна была даць 2 млн. 100 тыс. кубамэтраў лесаматар'ялаў і 1 млн. 143 тыс. раўмэтраў дроў.

КАЛІ ЗАДАНЬНЕ АСОБНАГА КВАРТАЛУ ПА ЗАГАТОЎЦЫ ДЗЕЛАВОЙ ДРАЎНІНЫ ВЫКАНАНА НА 133%, ДЫК ЗАДАНЬНЕ ПА ЗАГАТОЎЦЫ ДРОЎ ВЫКАНАНА ТОЛЬКІ НА 24,3%, А ПА ВЫВАЗЦЫ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ — НА 20,1%.

Такое недавыкананьне раўняецца зрыву праграмы лесазагатовак, ускладненьне пасьпяховае выкананьне прамфінпляну ў дрэваапрацоўчай і запалкавай прамысловасьці, стварыла некаторыя перабоі ў забесьпячэньні дрывамі гарадоў Беларусі.

Значна павялічаная праграма лесазагатовак на бягучы квартал вызначана па ЗАГАТОЎЦЫ дзелавой драўніны ў 2 млн. 901.360 кубамэтраў і дроў—2.932.280 раўмэтраў; па ВЫВАЗЦЫ дзелавой драўніны — 5.600.720 кубамэтраў і дроў — 4 млн. 210.470 раўмэтраў.

Асноўная частка праграмы 1931 году пабудавана з разьліку пакрыцьця прарыву ўдарнага кварталу 1930 году і прыкладна на 75% павінна быць выканана ў БЯГУЧЫМ квартале гэтага году, вынікі і тэмпы работы ў якім па сутнасьці справы вырашаць вынік усёй лесазагатоўчай кампаніі 1931 году — трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Няма патрэбы даводзіць, якое важнае гаспадарча-палітычнае значэньне мае выкананьне праграмы лесазагатовак бягучага году.

Між тым, апошнія весткі сьведчаць аб далёка нездавальняючым, а месцамі і пагражаючым становішчы лесазагатовак.

У першай дэкадзе студзеня загатоўлена, дзелавой драўніны 7,4% і дроў— 2,4%. Вывезена дзелавой драўніны 1,5%, дроў — 2,8% праграмы бягучага кварталу.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што на ЛЕСАЗАГАТОЎЧЫМ ФРОНЦЕ ЯШЧЭ НЕ ДАСЯГНУТЫ УДАРНЫЯ ТЭМПЫ, ЯКІЯ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА НЕАБХОДНАЙ УМОВАЙ ДЛЯ ШПАРЧЭЙШАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПРАГРАМЫ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ 1931 ГОДУ.

Улічваючы такое становішча ў справе лесазагатовак, урад БССР абвясьціў УДАРНЫ МЕСЯЧНІК ЛЕСАЗАГАТОВАК — з 15 студзеня па 15 лютага, — асноўнай задачай якога зьяўляецца стварэньне патрэбнага пералому на гэтым адказнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

Але для таго, каб гэты пералом стварыць, каб забясьпечыць посьпех лесазагатовак, мы павінны ясна бачыць недахопы, якія ёсьць у лесазагатоўчай рабоце і якія выяўлены ў леташнюю кампанію.

«ЗМАГАЦЦА З БЮРАКРАТЫЗМАМ, НЕПАЛАДКАМІ, ШКОДНІЦТВАМ, З КОНТР - РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ КУЛАЦТВАМ, З ПРАВЫМ АПАРТУНІЗМАМ НА ПРАКТЫЦЫ І МЕЦЬ ЗАЎСЁДЫ ПЕРАД САБОЙ КАНКРЭТНУЮ ПРАГРАМУ ЛЕСАЗАГАТОВАК, ЯК БЕЗАГАВОРАЧНАЕ БАЯВОЕ ЗАДАНЬНЕ ПАРТЫІ І ЎРАДУ, ТАКІМ ПАВІНЕН БЫЦЬ ХАРАКТАР БУДУЧЫХ ЛЕСАЗАГАТОВАК» («Правда» ад 30-X-30 г.).

Ці знайшла гэтая прынцыповая ўстаноўка сапраўднае адлюстраваньне ў рабоце мясцовых партыйных, савецкіх органаў, у лесазагатоўчым апараце? Далёка НЕ.

АСНОЎНАЙ ПРЫЧЫНАЙ ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАГА ХОДУ ЛЕСАЗАГАТОВАК ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПРАВА-АПАРТУНІСТЫЧНАЯ НЕДААЦЭНКА ГЭТАЙ ВАЖНЕЙШАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ КАМПАНІІ З БОКУ РАДУ РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, НЕРАЗУМЕНЬНЕ ТАГО, ШТО ЯНА ПАВІННА ПРАВОДЗІЦЦА ПА-ЎДАРНАМУ, ПА-БАЛЬШАВІЦКУ.

З самага пачатку лесазагатовак рад мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый стаялі ў баку ад гэтай кампаніі. Вакол лесазагатовак ня была мабілізавана шырокая грамадзкая думка. РАСТЛУМАЧАЛЬНАЯ РАБОТА СЯРОД КАЛГАСНІКАЎ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС КУЛЬГАЛА НА АБЕДЗЬВЕ НАГІ. Масы і да гэтага часу ў радзе раёнаў не мабілізаваны на руйнуючы адпор кулацтву і яго «агітропаму», якія так старанна вядуць сваю шкодніцкую работу з мэтаю сарваць праграму лесазагатовак. Далёка ня ўсюды вядзецца бязьлітаснае змаганьне з агентурай кулацтва — правымі і «левымі» апартуністамі, засёўшымі ў лесазагатоўчых апаратах, райвыканкомах і сельсаветах, якія, выконваючы сацыяльны заказ кулака, ныюць, што пляновыя заданьні «непасільныя» для выкананьня.

Важнейшым пытаньнем выкананьня плану лесазагатовак зьяўляецца забесьпячэньне іх рабочай і гужавой сілай. А між тым, партыйныя і савецкія арганізацыі ЖЛОБІНСКАГА, БУДА-КАШАЛЕУСКАГА, РАГАЧОЎСКАГА РАЁНАЎ, якія зьяўляцца пастаўшчыкамі кваліфікаваных рабочых для іншых раёнаў — не забясьпечылі Лесбелу і Наркампрацы спрыяючых умоў для вярбоўкі і перакідкі рабочых.

Вялікай важнасьці кампаніі самаабвязацельствоў у большасьці месц выканана фармальна — ня была праведзена адпаведная растлумачальная масавая работа.

У многіх месцах цьвёрдыя заданьні ДА КУЛАЦКІХ ГАСПАДАРАК НЕ ДАВЕДЗЕНЫ. Лесазагатоўчы апарат, рад райвыканкомаў і сельсаветаў ня стаялі досыць мабільнымі і гібкімі ў шпарчэйшым давядзеньні плянаў лесазагатовак і вывазцы дроў і лесаматар'ялаў да кожнага кулацкага двора. Там, дзе гэта праведзена ФАРМАЛЬНА — адсутнічае ГРАМАДЗКІ КАНТРОЛЬ над выкананьнем даных заданьняў.

У радзе месц паасобныя сельскія саветы і сельсаветчыкі на справе прыкрываюць тых, хто ўхіляецца ад выкананьня даных нарадаў, і гэтым самым дапамагаюць клясаваму ворагу — кулацтву зрываць пляны лесазагатовак.

Засёўшыя там апартуністы — адкрытыя агенты клясавага ворага—ня прыцягваюцца да суровай адказнасьці, ня зьнімаюцца з работы.

Удзельная вага САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СЭКТАРУ ў лесазагатоўках значна ўзрасла. Паводле падлікаў Белкалгасцэнтру, калгасы Беларусі могуць прадаставіць у зімовы лесазагатоўчы сэзон у сярэднім у месяц 8 тыс. лесарубаў і 20 тыс. коняй. Між тым большавіцкіх тэмпаў у выкананьні калгасамі сваіх заданьняў пакуль што яшчэ няма.

Дагавары паміж леспрамгасамі і калгасамі на выкананьне вызначаных заданьняў па загатоўцы і вывазцы нават яшчэ не заключаны. Такія адносіны да гэтай работы з боку леспрамгасаў і раду мясцовых кіруючых калгасных органаў нельга інакш расцэньваць, як праяву правага апартунізму на практыцы.

ЛЕСАЗАГАТОЎЧЫ АПАРАТ па-ранейшаму едзе на абломаўскіх тэмпах, ня ўжываючы ніякіх захадў да пераходу да новых форм работы ў галіне вярбоўкі і арганізацыі рабочай сілы. У радзе зьвяньняў лесазагатоўчага апарату ўсё яшчэ пануе шкодная права-апартуністычная стаўка на «самацёк».

КААПЕРАЦЫЙНЫ АПАРАТ, на які была ўскладзена задача забесьпячэньня лесазагатовак прадуктамі харчаваньня і прамтаварамі, ня быў пастаўлен на службу лесазагатовак. Адсутнічае кантроль за правільным асартыментам тавараў ды давядзеньнем прадуктаў і прамтавараў да лесарубаў і возчыка і за правільным іх выдаткаваньнем. У гэтым пытаньні зусім ня ўлічаны вурокі лесасплаўчай кампаніі, калі, дзякуючы адсутнасьці кантролю за выдаткаваньнем прэміяльных фондаў, быў дапушчаны рад агідных учынкаў у справе прэміяваньня. Якасьць лесарубных інструментаў часамі нікуды нявартая. Для палляпшэньня гэтай справы лесазагатоўчы апарат ня прымае ніякіх захадаў.

Культурна-масавая работа сярод лесарубаў пастаўлена в рук вон дрэнна. Нават сярод пастаянных кадраў лясных рабочых амаль ніякай работы не вядзецца. САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА ў лесазагатоўках існуе пакуль што толькі ў гучных рэзалюцыях і прыгожых дагаворах, у той час, калі ёсьць усе магчымасьці разгарнуць гэтыя асноўныя мэтады нашай працы, аб чым сьведчаць дасягненьні ў паасобных, на жаль, нячыматлікіх выпадках.

Амаль нічога ня робіцца ў галіне правільнай арганізацыі працы. Лесарубы не арганізуюцца мэтадам брыгад На рацыянальную распрацоўку і утылізацыю драўніны на лесасеках зварачаецца надзвычай мала ўвагі. У пагоні за выкананьнем колькасных заданьняў часта зусім забываецца ЯКАСНЫ бок работы.

УДАРНЫ МЕСЯЧНІК ЛЕСАЗАГАТОВАК ПАВІНЕН БЫЦЬ НАКІРАВАНЫ НА ХУТЧЭЙШУЮ ПЕРАМОГУ ЎСІХ ПАКАЗАНЫХ БУЙНЫХ НЕДАХОПАЎ, усіх «вузкіх месц» на лесазагатоўчым фронце.

Ударны месячнік, які праводзіцца пад лёзунгам «ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ АСОБНАГА КВАРТАЛУ 1930 ГОДУ І 100% ВЫКАНАНЬНЯ ПРАГРАМЫ БЯГУЧАГА КВАРТАЛУ», павінен цалкам забясьпечыць пасьпяховасьць лесазагатовак 1931 году.

ПЕРАЛОМ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗРОБЛЕН БЕЗАДКЛАДНА. Задача партыйных і савецкіх арганізацый—па-бальшавіцку пераключыцца на лесазагатоўчы фронт. Задача партыйных камітэтаў — мабілізаваць усю грамадзкасьць на штурм лесазагатовак. КАМСАМОЛ БЕЛАРУСІ ПАВІНЕН САПРАЎДЫ ВЫКАНАЦЬ ПАСТАНОВУ АБ МАБІЛІЗАЦЫІ КАМСАМОЛЬЦАЎ НА ЛЕСАЗАГАТОЎКІ.

ПРАФСАЮЗЫ на чале з ЦСПСБ і ў першую чаргу саюз сель-гасп. і лясных рабочых павінны зараз-жа кінуць лепшыя свае сілы на арганізацыю і кіраўніцтва растучай актыўнасьці лесарубаў і ўсіх працоўных на лесазагатоўках і лесавывазе.

Сацыялістычным спаборніцтвам на лесазагатоўках павінны быць ахоплены рабочыя ўсіх лясных вучасткаў. Сацспаборніцтва павінна прасякнуць усе зьвяньні лесазагатоўчай работы. Бязьлітасна біць па кулаку, які аказвае шалёнае супрацьўленьне пасьпяховаму разгортваньню лесазагатовак.

Рашуча выкрываць агентаў клясавага ворага — правых і «левых» апартуністаў, гнаць іх жалезнай мятлой з усіх зьвяньняў партыйнага, савецкага, лесазагатоўчага апарату.

Весьці няўхільную штодзённую барацьбу з апартунізмам на практыцы, са стаўкай на самацёк, з апартуністычнай недаацэнкай лесазагатовак — гэтай важнейшай, асабліва ва ўмовах БССР, гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Мы маем усе магчымасьці, усе ўмовы для пасьпяховага выкананьня плянаў лесазагатовак.

У часе месячніку — мабілізаваць усе сілы і ўвагу партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый на выкананьне задач, пастаўленых партыяй на лесазагатоўчым фронце.

Антысавецкі паход пад сьцягам Пан-Эўропы

ПАН-ЭЎРАПЭЙСКАЯ КАМІСІЯ Ў ЖЭНЭВЕ

Імпэрыялістыцкія драпежнікі баяцца ўдзелу ў камісіі савецкай дэлегацыі

ЖЭНЭВА, 17. На адкрытай сэсіі пан-эўрапэйскай камісіі ўчора з уступнай прамовай выступіў Брыян. Сваю прамову ён пачаў з указаньня, што над усёй Эўропай навісла цяжкая пагроза. Брыян заклікае «ўсе ўрады, салідарна адказныя за ахову эўрапэйскай цывілізацыі, аб'яднацца, каб жыць». Пытаньне аб прыцягненьні ў камісію дзяржаў, якія ня ўдзельнічаюць у Лізе нацый, Брыян усяляк стараўся замазаць, працаючы адчайна цямнымі словамі.

Выступаючы пасьля Брыяна Курціус падкрэсьліў, што Нямеччына асабліва закранута крызісам. Нямеччына,—заявіў Курціус,—пойдзе на любым шляху, які можа прывесьці да супольнага перамаганьня крызісу. Згадваючыся заслухаць спачатку даклад старшыні эканамічнай канфэрэнцыі Каліна, Курціус падкрэсьлівае неабходнасьць выпрацаваньня арганізацыйных пытаньняў, а іменна: пытаньня аб стварэньні бюро і пытаньня аб прыцягненьні эўрапэйскіх дзяржаў, якія не зьяўляюцца членамі Лігі. Курціус спытаў Брыяна, калі думае апошні падыйсьці да гэтых пытаньняў, якія ня могуць быць пакінуты пад сукно. Брыян залуе: «Я ўжо адзначыў, што ў прыцыпе трэба заклікаць да супрацоўніцтва ў Эўропе тых, хто праяўляе добрую волю». Пытаньне, аднак, у тым, у які момант гэта зрабіць: ці ў стадыі арганізацыі, ці ў стадыі падыходу да канкрэтных праблем. Пленум Лігі вырашыць гэта. Па гэтым пытаньні будзе вылучана камісія.

Грандзі (Італія) падкрэсьлівае, што адным з важнейшых пытаньняў зьяўляецца склад пан-эўрапэйскага абъяднаньня. Гэтым пытаньнем трэба заняцца з самага пачатку. Грандзі дамагаецца прыцягненьня ў камісію эўрапэйскіх дзяржаў, якія не зьяўляюцца членамі Лігі Нацый. «Які адказ,—гаворыць Грандзі,—дадуць на запрашэньне СССР і Турцыі,—я ня ведаю, але калі запрашэньня ня будзе, дык мы апынемся ў ніякім становішчы». Грандзі заўважае далей, што праблема эўрапэйскага супрацоўніцтва можа быць вырашана толькі тады, калі будуць выкананы абавязацельствы статуту Лігі нацый у пытаньні аб разбраеньні. «Скажаючыя ўзбраеньні,—гаворыць Грандзі,—ёсьць адзінае інтэгральнае вырашэньне праблемы бясьпекі».

Гендэрсон (Англія) адзначае, што прапанова Грандзі патрабуе ўдумлівага разгляду. Пытаньне, на думку Гендэрсона, цяжка вырашыць. Трэба назначыць камісію для выпрацоўкі парадку абмеркаваньня тых ці іншых пытаньняў.

Ухваляецца пастанова выбраць камісію і заслухаць яе прапановы пасьля дакладу Каліна.

На вячэрнім пасяджэньні пан-эўрапэйскай камісіі з вялікім дакладам выступіў старшыня лістападаўскай эканамічнай канфэрэнцыі галяндзец Каліп. Дакладчык паказаў, што рэзультаты лістападаўскай канфэрэнцыі, у аснову якой была пакладзена ідэя ліквідацыі мытных бар'ёраў, аказаліся надзвычай мізэрнымі. Не ўдалося заключыць ні адной канвэнцыі па колькі-небудзь важных пытаньнях. Параўнальна з 1927 годам становішча пагоршылася ня толькі ў пытаньні аб тарыфах, але таксама і ў адносінах да ўсіх відаў укоснага пратэкцыянізму, як: дэмпінг, экспартныя премії і г. д. «Ва многіх краінах,—заявіў дакладчык,—народы згубілі ўсякае давер'е да эканамічнай работы Лігі нацый».

Далей дакладчык заявіў: «Хутка рухнуць апошнія цытадэлі вольнага гандлю. Вострыманы пратэкцыянізм пагражае патрасьці агульнае становішча Эўропы». Дакладчык паказвае на первачарговасьць задачы арганізацыі эканомікі Эўропы і неабходнасьці дабіцца хаця-б уступленьня ў моц канвэнцыі (аб мытным перамір'і). Абмеркаваньне дакладу адкладваецца па заўтра.

Пасьля заслуханьня дакладу Каліна камісія, згодна прапанове выбраной раніцай камісіі парадку дня, вырашыла заўтра раніцай на закрытым пасяджэньні абмеркаваць пытаньне аб прыцягненьні эўрапэйскіх дзяржаў, якія не зьяўляюцца членамі Лігі нацый. Як перадаюць, на пасяджэньні камісіі парадку дня супроць запрашэньня СССР і Турцыі рэзка выступалі Бэлерц (Галяндыя) і Гімакс (Бэльгія). Гендэрсон, быццам, наадварот, выказаўся за запрашэньне. Нарэшце было пастаноўлена абмеркаваць пытаньне на закрытым пасяджэньні ў мэтах «больш свабоднай дыскусіі».

На заўтрашнім закрытым пасяджэньні чакаецца жывая дыскусія. Паводле чутак, Брыян разьвівае ўзмоцненую антыўрасьць у кулуарах, даказваючы ўсялякі, што пытаньне аб запрашэньні кваленаў Лігі нацый яшчэ не насьпела. (ТАСС).

Супроць крывавай оргіі
АЗЬВЯРЭЛЫХ ФАШЫСЦКІХ КАТАЎ НАД ПРАЦОЎНЫМІ МАСАМІ ЗАХ. УКРАІНЫ І ЗАХ. БЕЛАРУСІ

Рэзалюцыя пратэсту

Заслухаўшы інфармацыю аб крывавым тэроры польскага фашызму ў Зах. Украіне і Зах. Беларусі, МЫ, СТУДЭНТЫ І СУПРАЦОЎНІКІ КАМУНІСТЫЧНАГА УНІВЭРСЫТЭТУ БЕЛАРУСІ ўзьнімаем голас рашучага пратэсту супроць зьверстваў і катаваньняў разьюшанай паліцэйшчынай лепшых прадстаўнікоў рабочай клясы і працоўных мас сялянства.

Сусьветны імпэрыялізм знаходзіцца пад ударамі нячуванага эканамічнага крызісу. Крызіс параліжуе капіталістычную сыстэму і ўздымае хвалю рэвалюцыйнага руху на вышэйшую ступень. Беспрацоўе расьце гіганцкімі крокамі. А ў гэты час у СССР небачанымі ў гісторыі чалавецтва тэмпамі, пад ленінскім кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, будуецца сацыялізм. Там галеча і голад пагражаюць крахам капіталістычнай сыстэме. Тут — у бацькаўшчыне працоўных усяго сьвету — РАСТУЦЬ НОВЫЯ ГІГАНТЫ, ПАЛЯПШАЕЦЦА МАТАР'ЯЛЬНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ СТАНОВІШЧА РАБОЧАЕ КЛЯСЫ І ПРАЦОЎНЫХ МАС СЯЛЯНСТВА.

Сусьветны імпэрыялізм, — асабліва слабейшы і найгнілейшы прадстаўнік яго—фашысцкая Польшча — апынуўся ў цісках вастрэйшага эканамічнага крызісу, які ўсё больш паглыбляецца і пераходзіць у крызіс палітычны. Адзіны выхад з гаспадарчага развалу польскі фашызм бачыць у вайне супроць Савецкага Саюзу.

Калі 12 год працоўныя Зах. Украіны, Зах. Беларусі і ўсе Польшчы стогнуць пад ботам польскага фашызму. Апошнія сыгналы і падзеі ў Зах. Украіне і Зах. Беларусі яшчэ больш заклінаюць працоўных быць на варце. Польскі фашызм шалёна рыхтуецца да інтэрвэнцыі супроць СССР. УрадА катаў і зьдзекаў падрыхтоўвае тыл, каб мець надзейны плядарм для вае-ных падзей і паходу. Зах. Украіна і Зах. Беларусь наваднены карнымі экспэдыцыямі, якія зьнішчаюць цэлыя вёскі, зьбіваюць сялян, гвалтуюць жанчын, нішчаць сялянскую маемасьць і г. д. Зьдзекам і крывавай расправе підсудчыкаў-няма канца, — катаваньні і забойствы сялян прымаюць масавы характар. Зах. Украіна залітая крывёю працоўных. У турэмных бальніцах «цывілізаванай» дзяржавы пякуць тысячы ахвяр фашысцкіх катаў. Лепшыя пралетары катуюцца і замучваюцца дэфэнзыўчыкамі на-сьмерць.

Ва ўсіх гэтых падзеях прымаюць самы актыўны ўдзел агенты польскага фашызму — САЦЫЯЛ- І НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫСТЫ ЗАХ. УКРАІНЫ І НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫСТЫ ЗАХ. БЕЛАРУСІ. Яны разам з фашысцкім урадам Польшчы катуюць рабочых і сялян, льюць рэкі крыві працоўных.

Мы з абурэньнем пратэстуем супроць зьдзекаў і нудасных катаваньняў працоўных мас паліцэйшчынай і жандармерыяй фашысцкае Польшчы.

Мы заклікаем рабочую клясу і працоўнае сялянства БССР і усяго СССР узьняць магутны голас пратэсту супроць крывавых распраў фашысцкіх катаў над лепшымі прадстаўнікамі рабочае клясы і працоўнага сялянства Зах. Украіны і Зах. Беларусі.

МЫ РАШУЧА ПАТРАБУЕМ СПЫНІЦЬ КРЫВАВУЮ ОРГІЮ АЗЬВЯРЭЛЫХ САДЗІСТАЎ—ЗАРЭМБАЎ, КАВАЛЬЧУКОЎ і іншых катаў над рабочымі і сялянамі.

Таварышы рабочыя і сяляне!

Мы запэўняем вас, што ўсе сілы мабілізуем на выкананьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі і аслабшэньне пабуловы сацыялізму ў СССР.

Прэч крывавы тэрор! Нехай жыве сусьветная рэвалюцыя!

Разгром адзінай у Польшчы антыфашысцкай газэты „Пшэглёнду Сполэчнэго“

ВАРШАВА, 12. У Кракаве мясцовымі ўладамі закрыта адзіная ў Польшчы антыфашысцкая газэта «Пшэглёнд Сполэчны». Супрацоўнікі арыштаваны. Напярэдадні закрыцьця гэтае газэты пэрэсэфусні орган «Пшэгляд» выступіць супроць «Пшэглёнду Сполэчнэго» з рэзкім артыкулам, у якім абвінавачваў газэту ў тым, што яна «камуністычная».

Забойства селяніна за лоўлю рыбы ў панскім возеры

Селянін Дайноўскі з вёскі Міжрэчча, Троцкай волясьці, папоў у панскае возера паланіць рыбы. Надышоў лясьнічы, які ахоўвае дворы гэтага памешчыка. Ён адабраў ад селяніна палаўленую рыбу і хацеў лягчэ завесьці яго на пастарунак паліцыі. Селянін адмовіўся ісьці, за што стрэлам з дубальтэта быў забіты на месцы.

Падрыхтоўка „галоднага паходу“ у Амэрыцы

НЬЮ-ЁРК, 15. Саветы беспрацоўных ва ўсёй краіне энэргічна праводзяць кампанію пад лёзунгам «Забараньняў страхаваньня ад беспрацоўя». Учора ў Нью-Ёрку адбылася канфэрэнцыя адзінага фронту, на якой прыстутнічала 700 дэлегатаў, што представляюць амаль 500 арганізацый гораду Нью-Ёрку і акругі. На канфэрэнцыі быў выкінуты плян арганізацыі ў сярэдзіне лютага галоднага паходу у сталіцу штату Нью-Ёрк, Альбані. Далей канфэрэнцыя пастанавіла правесьці 180 вуліцкіх мітынгаў і выбрала 10 дэлегатаў у склад нацыянальнай дэлегацыі беспрацоўных, якая выедзе ў Вашынгтон 10 лютага, каб перадаць кангрэсу патрабаваньні беспрацоўных.

«Дэйлі Уоркэр» паведамляе аб радзе дэманстрацый беспрацоўных у іншых гарадох. У Чыкага на 5-тысячным мітынгу беспрацоўных выступаў лідэр дэмпартыі Фостэр. Тысячная маса беспрацоўных, якія [illegible] на мітынгу, да якіх [illegible] былася значная колькасьць людзей, [illegible] сталі ў чарэ за хлебам, прабавала арганізаваць дэманстрацыю. Аднак, паліцыя разагнала натоўп, збіваючы дэманстрантаў палкамі, крычым пекалі залавеі пагранеца.

Тым часам беспрацоўе расьце. Упаўнаважаны па справах прамысловасьці ў штаце Нью-Ёрк заявіў, што лік занятых рабочых на працягу сьнежня скарацілся на 4 проц.

10 тысяч чыгуначнікаў у Саксоніі выкідваецца на вуліцу

БЭРЛІН, 12. Кіраўніцтва нямецкіх чыгунак парушыла калдагавор, узяло на саксонскіх чыгунках скарочаны рабочы тыдзень і скарацілі ў адпаведным разьмеры зарплату чыгуначнікаў Саксоніі. Рэфармісцкія прафбюракраты абмеркавалі гэта пытаньне і пастанавілі «умоўна» падпарадкавацца мерапрыемствам кіраўніцтва. Рэвалюцыйныя тэзы, на сутнасьці, безагаворачную жэрву рэфармістаў на праведзенае скарачэньне зарплаты, кіраўніцтва чыгунак абвясьціла, што з 16 студзеня лічацца вызваленымі 10 тыс. рабочых саксонскіх чыгунак.

УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА ПА КАЛГАСНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

МСКВА, 17. 16 студзеня адкрылася ўсесаюзная нарада па калгаснай жывёлагадоўлі. З дакладам аб вынніках першага году абагульненьня жывёлы і аб задачах калгаснае жывёлагадоўлі у 1931 годзе выступіў тав. Юркін. «Калгасы,—заявіў дакладчык,—ужо зараз маюць звыш 8 тыс. малочных фэрм і 450 тыс. кароў. Усяго абагулена нароў 4 млн. галоў буйнае жывёлы, у тым ліку 1,7 млн. кароў і звыш 1 млн. сьвіней.

Плянам 1931 году прадугледжваецца павялічэньне стада абагуленых нароў да 4 млн., сьвіней — да 5 млн., авец— да 9 млн. Прымаюцца меры да стварэньня моцнай кармавой базы ў 1931 годзе; плошча кармавых траў будзе займаць 9 млн. га зямлі, а сістэмы культуры — 700 тыс. га.

У 1931 годзе будзе пераведзена 350 тыс. жывёлаводаў масавай кваліфікацыі, якія павінны быць падрыхтаваны з аспрэдзьня калгасьнікаў. У 1931 годзе лік галоў малочнай жывёлы ў фэрмах будзе даведзены да паўтара мільёна. Малочна-таварныя фэрмы Сібіры і Урагу, дзякуючы правільнай арганізацыі догляду і кармленьня, ужо дабіліся значных посьпехаў, павысіўшы ўдой кароў у варэўнянні з індывідуальнымі гаспадаркамі на 50%. Аб такіх посьпехах павінна ведаць уся калгасная маса.

Рэвалюцыйная барацьба баўгарскага пралетарыяту

(Ліст з Баўгарыі, атрыманы на мове эсперанто)

Підзе, балай, каміталістычная рацыяналізацыя ня выклікала такога вострага крызісу, як у Баўгарыі, дзе яна вэшцьцяляецца пры дапамозе белага тэрору. Беспрацоўе ўвесь час пашыраецца. Ё 500.000 пралетараў 200.000 — беспрацоўныя. Але пытаньне аб беспрацоўі ня цікавіць баўгарскі ўрад. Ён мае больш важныя і сьнешныя справы для вырашэньня...

У Баўгарыі беспрацоўныя не атрымліваюць ніякай дапамогі.

Становішча працуючай часткі рабочых ня лепш жудаснае. Підзе няма 8-гадзіннага працоўнага дня. Підзе не захоўваюць законаў аб працы. Нішчасныя выпадкі —звычайная справа. Для паноў і іх служак—сацыял-фашыстаў рабочыя горш за скаціну. Увесь час зьмяншаецца заработная плата, у той час як дарагоўля ўзрастае. Акрамя таго, заработная плата выплачваецца не рэгулярна, нават часта зусім ня выплачваецца. Калі рабочыя скардзяцца інспэктару працы, апошні паведамляе аб гэтым гаспадара, які іх звальняе. Калі-ж рабочы зьвяртаецца ў інспэкцыю працы — яго толькі лаюць і гонаць.

Таму, ня гледзячы на жорсткі белы тэрор, які лічыць забастоўшчыкаў дрэнежнікамі, забастоўкі надзвычайна пашыраюцца ў Баўгарыі. У мінулым годзе забастоўка табачных рабочых пачалася 2 тыдні і ў ёй прымалі ўдзел 30-40.000 рабочых. Цяпер таксама чакаюць вялікіх забастовак, асабліва ў табачнай прамысловасьці. Для таго, каб забастоўкі былі пасьпяховыя, неабходны грошы для падтрыманьня забастоўшчыкаў, калі ім выражае гаспадная сьмерць. Але ў забастовачным фондзе зусім ня было грошай. Тады левыя прафсаюзы абвясьцілі голодны дзень. У гэты дзень працоўныя рабочыя павінны былі чалядаць і перадаць дзённы заробак у забастовачны фонд. Па адной толькі Сафіі сабралі 12.000 левяў, але на гэтым ня спынілісь і збор працягваецца і далей. Галоўная задача—сабраць 1.000.000 левяў у забастовачны фонд.

Улада ўсіні сродкамі перашкаджае гэтаму. У г. Варне на працягу ўсяго дня рабочы клюб, куды павінны былі прыносіць грошы, быў абкружаны і шмат рабочых арыштаваны, ня гледзячы на тэрор.

Але баўгарскія працоўныя працягваюць кіруючае вызваленьне за сваё вызваленьне.

КАМПАРАНО.

Тварам да мопраўскай работы

Вялізарныя задачы, якія стаяць перад беларускім МОПР'ам у галіне арганізацыі маральнай і матар'яльнай дапамогі працоўных мас БССР барацьбітом міжнародна рэвалюцыі, патрабуюць для свайго вырашэньня ўзмацненьня працы на інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных і найбольш шырокага ўдзелу мопраўскіх арганізацый у сацыялістычным будаўніцтве. Відома, што рашаючай умовай пасьпяховага вырашэньня ўсіх гэтых задач зьяўляецца цьвёрдае і ўважлівае кіраўніцтва з боку партарганізацый.

Але на ўсе партыйныя арганізацыі ўлічылі ўсю важнасьць ролі МОПР'у ў дадны вэрыад і як надежныя пы кіруюць МОПР'аўскай арганізацыяй, адзінай арганізацыяй, якая па сутнасьці ўсёй сваёй працай служыць справе выхаваньня працоўных у інтэрнацыянальным духу.

Цэлы рад абуравочых фактаў, якія вядомы «Зьвязьдзе», аб недапушчальных адносінах партарганізацый да МОПР'аўскай работы і само становішча беларускай арганізацыі МОПР'у на сёньняшні дзень (яна залічана на чорную дошку), — гаворыць за тое, што кіраўніцтва з боку партарганізацый трэба лічыць зусім невыстарчальным. Адносіны-ж паасобных партыйных ячэек і камуністаў да арганізацыі МОПР'у зьяўляюцца прыкладам ня ўнага правага апартунізму на практыцы. Вось некалькі прыкладаў.

Калі сакратар Барысаўскага РК МОПР'у тав. Сагаловіч пажадаў пагаварыць з сакратаром Кампітэту партыі тав. Саснаўскім аб рабоце МОПР'у, апошні зусім адмовіўся з ім таварыць.

Сакратар Ансьціслаўскага РК партыі тав. Раманенко і загалчык культ.-масавым сэктарам т. Грэцкі таксама «вельмі добра» аказваюць садзейнасьць арганізацыі МОПР'у ў яе рабоце. Калі на МОПР'аўскіх справах да іх абодвух зварачаецца сакратар РК МОПР'у тав. Грэчнікаў, яны адсылаюць яго адзін да другога і фактычна ніякай садзейнасьці не аказваюць.

Цяпер праводзіцца кампанія зімовай дапамогі барацьбітом рэвалюцыі. Як вядомы некаторыя кіраўнікі нашых грамадзкіх арганізацый значэньне гэтай пахітычнай кампаніі, можна ўбачыць са слоў старшыні фабкому фабрыкі імя Гірны Лекерта, камуніста Каршакова.

«Зьбярэце ім дзьве капейкі і хопіць». Такую «дыпрэтыву» ён даў старшыні ячэйкі МОПР'у наконт правядзеньня гэтай кампаніі.

Тав. Каршакову трэба было на 14 годзе Кастрычніцкай рэвалюцыі ведаць, што ня не дась нашым замежным таварышам кейкуч хлеба, як калісьці пасьлі дзяржаўнага «дамы» на нашых бедных, а мы выкорыстаем наш абавязак пралетарскай міжнароднай салідарнасьці.

Іншыя таварышы для таго, каб адмахнуцца ад МОПР'у спасылаюцца на патрэбнасьць выкананьня прамфінпляну, перавыбары саветаў і г. д., не разумеючы, што МОПР'аўская ячэйка і МОПР'аўская работа павінны быць песна зьвязаны з барацьбой за выкананьне прамфінпляну і са ўсёй бягучай палітыкай. Да гэтых таварышоў трэба адносіці аднаго з членаў бюро калектыву КП(б)Б фабрыкі «Дзьвіна», які зьяўляецца таксама членам ЦК ЛКСМБ. На запытаньне, як лепш правесьці работу МОПР'у, ён адказаў: «у нас прамфінплян і мы ня можам займацца МОПР'ам» Ці ня лепш было-б замест спасылкі на аб'ектыўныя ўмовы прыцягнуць да барацьбы за выкананьне прамфінпляну і мопраўскую ячэйку. У выніку гэтай апартуністычнай абмежаванасьці і захаваньня суровай «чаргі» ў кампаніях і рабоце, арганізацыі МОПР'у на фабрыцы «Дзьвіна» амаль ня існуе.

Можна падаць яшчэ цэлы рад фактаў, якія-б ярка сьведчылі аб недаацэнцы работы МО

УСЮ БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКУЮ МАСУ ЎВЕСЬЦІ Ў БОЙ

ЗА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ, СУПРОЦЬ КУЛАЦТВА, ЗА ПОУНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ

Выкрываць кулацкую агентуру і беспаваротна гнаць яе з радоў партыі Леніна

Падрыхтоўку да бальшавіцкай вясны

ЯЧЭЙКІ АДЗНАЧАЮЦЬ АРГАНІЗАЦЫЯЙ НОВЫХ КАЛГАСАЎ

У адпаведнасьці з апошняй пастановай ЦК КП(б)Б аб рабоце з беднатой многія вясковыя раённыя партарганізацыі пераключыліся ў сваёй рабоце, стварылі ў гэтай справе пэўны пералом. Рашуча адкідаючы апартуністычныя разважаньні аб непатрэбнасьці работы з беднатой, аб «няматэзгоднасьці» ўцягненьня ў калгасы беднякоў і батракоў, з прычыны адсутнасьці ў іх маемасьці (такія разважаньні мелі месца ў наасобных калгасных парт'ячэйках), парт'ячэйкі ў сваёй большасьці ўзяліся за арганізацыю батрацка-бядняцкіх груп пры тых выбарчых савецкіх і кааперацыйных органах, дзе гэтых груп не існавала, узялися за наладжаньне систематычнай работы сярод беднаты.

Тыя вялізарныя задачы, якія паставлены сьнежаньскім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) перад сельскай гаспадаркай на 1931 г., патрабуюць напружанай выразнай работы на мабілізацыі бядняцка-серадняцкіх мас на выкананьне плянаў вясновай пасеўнай кампаніі, на забесьпячэньне далейшых посьпехаў сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як класа на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Асноўнай умовай пасьпяховага ажыцьцяўленьня задач сёлетняй пасеўнай кампаніі зьяўляецца далейшая неаслабная барацьба супроць клясавага ворага — кулацкіх, паўпанскіх і нікодзіцкіх элементаў, якія аказваюць шаленае супраціўленьне сацыялістычнаму наступленьню, далейшая барацьба супроць агентуры клясавага ворага—правых і «левых» апартуністаў.

Тыя посьпехі, якія дасягнуты за мінулы год на калектывізацыі сельскай гаспадаркі, магчымы былі дзякуючы ўзрастаючай актыўнасьці і творчаму энтузіязму рабочай клясы і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства ў практычным ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі, дзякуючы бязьлітаснай барацьбе партыі на два фронты — супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі, супроць «левых» апартуністаў і прыціскаючы да ўхілаў. Практычныя вынікі ў справе калектывізацыі і правядзеньня чартовых гаспадарча - палітычных кампаній на вёсцы ў кожным наасобным сельсавеце зьяўляюцца паказальнікам адпаведнасьці тэй ці іншай парт'ячэйкі ва большасьцю змаганьня за генэральную лінію партыі.

Праілюструем гэта на прыкладах работы некаторых ячэек.

Насовіцкая парт'ячэйка (Гомельскі раён) доўгі час знаходзілася ў палоне апартунізму. На чале калгасу «Новы шлях», які абслугоўваецца гэтай ячэйкай, таксама было апартуністычнае кіраўніцтва. З гэтай прычыны калгас «Новы шлях» ня толькі ня меў росту ці мінулы год, але дакоўніў да развалу. Ячэйка не аказвала ніякай увагі на вытворчасьць калгасу. Наасобныя «камуністы» адмаўляліся арганізаваць свае сродкі вытворчасьці і разбазарвалі жывёлу. Яны адкрыта прапагандавалі правапартуністычную тэорыю аб непасільнасьці чыста калектывізацыі і гэтым самым аказывалі пазыцыі клясавага ворага—кулака.

Парт'ячэйка корстна ўдарыла па кулацкай агентуры ў сэкіх радох, зьмяніла парткіраўніцтва і выкінула з партыі пэўных апартуністаў. Зьмяніўшы кіраўніцтва, парт'ячэйка павярнулася тварам да ажыцьцяўленьня ўнутрыкалгаснага будаўніцтва, пачала большавіцкае змаганьне за замацаваньне калгасу «Новы шлях» і дамагае разгортаньне калектывізацыі ў большасьцю. Зараз разгорнуты падрыхтоўка да другой калгаснай вясны. Гэта работа ўвянчаецца з перабоўкай новых калгаснікаў. **За апошні час калгас «Новы шлях» вырас на 50 новых гаспадарак.** Ячэйка склала з калгаснікаў групы перабоўшчыкаў, пры дапамозе якіх ячэйка **пры актыўным удзеле камсамольцаў арганізавала новы калгас імя X зьезду ЛКСМБ**, які ядае ўжо 40 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Калгаснікі выбралі старшынём праўленьня рабочага — «25-тысячніка» Даўгалова, які правяду арганізатарскія здольнасьці ў кіраўніцтве і замацаваньні новага калгасу.

Майская парт'ячэйка (Жлобінскі р-н) таксама разгарнула шырокую работу на растлумачэньні цастаноў сьнежаньскага пленуму ЦК УсеКП(б), мабілізуючы масы на прыняцьцё ім у жыцьцё гэтых пастаноў. Гэта ячэйка зараз зьяўляецца сапраўдным штабам у сельсавеце па калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Дадатным вынікам вокал работы варбованых груп, дзякуючы якім у сельсавеце **узьнікла магутная хваля калгаснага прыпіву імя трэцяга рашаючага году пяцігодкі. За апошні час у калгас «Расьвьвет — Пэрамога» уступіла напя 100 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.**

Большасьць парт'ячэек **Мазырскай** раённай партарганізацыі падрыхтоўку да вясновай пасеўнай кампаніі праводзіць апартуністычнымі тэмпамі.

Перадавой у Мазырскай арганізацыі па выкананьні задач партыі на вёсцы зьяўляецца **тольці Слабодзкая** парт'ячэйка. Ні гасьцячы на шаленае супраціўленьне куляцтва, парт'ячэйка адолела мабілізацыю палітычную актыўнасьць бядняцка-серадняцкіх мас на выкананьне задач калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Ячэйка сыстематычнай работай сярод беднаты, накіраванай на ўзмацненьне сяброў з серадняцкімі масамі, перадзітала ўсялякія варожыя супраціўленьні, замаскоўвала калгасы, гаспадарчыя мерыі якіх вынікіліся стымулем для іншых новых хвалі калгаснага руху. **Падрыхтоўчую работу да вясновай пасеўнай кампаніі ячэйка заканчвала арганізацыяй у сельсавеце новага калгасу імя трэцяга рашаючага году пяцігодкі. У гэты калгас абгрунтаваліся больш за 10 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.**

Пры вясновай пасеўнай кампаніі даведзен уже да калгасу і вёскі, да кожнага адзіначкоўца двара. У сувязі з абмеркаваньнем задач пасеўнай кампаніі ва ўсе калгасы паступае шмат заяў ад адзіначкоўцаў аб прыёме іх у калгасы.

Зусім інакшая справа ў іншых ячэйках Мазырскага раёну. Напрыклад, **Дудзіцкая** парт'ячэйка ганебна бязьдзейнічае. Ячэйка нічога яшчэ не зрабіла па мабілізацыі мас на выкананьне другой калгаснай вясны. Выразныя дырэктывы партыі аб калектывізацыі скажаюцца апартуністычнымі элементамі. У гэтай ячэйцы **нашуе** правапартуністычная практыка і «лявацкія» загібы. З гэтай прычыны існуючыя ў сельсавеце калгасы ня маюць росту. Ва ўсіх калгасах устаноўлена «пайковая» сыстэма. У калгасе імя **Капініна**, які зьяўляецца старэйшым у сельсавеце, да гэтага часу нават не абгаворан нарадак разьмеркаваньня ўраджаю, калгаснікі ня ведаюць да гэтага часу вынікаў свайго гаспадарчага году.

Замест бальшавіцкай работы па арганізацыі калгасаў на прынцыпах добраахвотнасьці, ячэйка то спадзяецца на самацёк, то кідаецца «ўлева». Паўтараюцца леташнія «лявацкія» загібы. **У калгасе «Рухавік рэвалюцыі», старшынём якога зьяўляецца сакратар парт'ячэйкі, дан калгаснікам двухдзённы тэрмін для абагульваньня рагатай жывёлы.**

Парт'ячэйка дапусьціла грубае скажэнне палітыкі партыі і ў падатковым пытаньні. У сельсавеце па выяўлены кулацкія і заможныя гаспадаркі для абкладаньня с.-г. падаткам у індывідуальным парадку. Затое дапушчаны актысерадняцкія перагібы ў выкананьні збожжазагатовак. На рад серадняцкіх гаспадарак, якія складаюцца з 3-5 дзесяцін зямлі і 1-2 шт. жывёлы, паложаны цьвёрдыя заданьні па здачы збожжа і бульбы. У в. **Буда** за невыкананьне цьвёрдых заданьняў на загатоўках, якія былі даны тром бядняцкім гаспадаркам, спаганы штрафы. **Ва старгі** па ўчышкі антысерадняцкіх перагібаў ячэйка прышывала тым асобам, якія скардзіліся, «ярлыкі падкулачнікаў», не заўважваючы таго, што дапушчаныя ячэйкаю антысерадняцкіх перагібы зьяўляюцца справай, выгоднай клясаваму ворагу.

Ня лепшае становішча і ў **МалаАўцюкевіцкай** парт'ячэйцы. Гэта ячэйка па сутнасьці стаіць у баку ад калгаснага руху. Апартуністычную бязьдзейнасьць ячэйкі выкарыстоўвае кулацтва, якое пачало актывізавацца асабліва за апошні час у сувязі з надыходзячай пасеўнай кампаніяй. Найбольш адсталая частка сялян-адзіначкоўцаў знаходзіцца пад уплывам кулацтва. Паміж калгаснікамі арцелі імя 1-га мая і вакольнымі адзіначкоўцамі існуе антаганізм. Ячэйка ніякіх захадаў ня ўжывае для наладжаньня правільных узаемадносін калгаснікаў з адзіначкоўцамі і выкрыцьця кулацкіх элементаў, якія імкнуцца супрацьставіць адзіначкоўцаў калгасу з мэтай зрыву пасеўнай кампаніі.

Мазырскі райком слаба рэагуе на апартуністычныя праявы ў рабоце наасобных ячэек. Райком толькі 6 студзеня разгарнуў работу на мабілізацыі партыйных і грамадзкіх сіл раёну на падрыхтоўку да бальшавіцкай пасеўнай кампаніі.

Посьпех выкананьня задач другой калгаснай вясны будзе залежаць ад своечасовай падрыхтоўчай работы, ад бязьлітаснага змаганьня супроць правага і «левага» апартунізму, які зьяўляецца асноўнай перашкодай на шляху сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

САЛДАЦЕНКА. КІСЯЛЬГОФ.

Адзіны фронт

апартуністаў і кулакоў супроць беднаты ў Глівінскай ячэйцы

Глівінская ячэйка КП(б)Б зьяўляецца адной з вялікіх калгасных ячэек Барысаўскага раёну. Ячэйка аб'ядная камуністаў з 5 старых і з некалькіх новых калгасаў. Вакол сельсавету, калгасаў і грамадзкіх арганізацый згрупавана некалькі дзесяткаў бядняцка-батрацкага актыву, які партыйная ячэйка магла-б скарыстаць для работы па ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі аб падрыхтоўцы да вясновай пасеўнай кампаніі, аб перабыбарах сельсавету і г. д.

Пытаньні работы з беднатой, з бядняцкім актывам, пытаньні кіраўніцтва калгасамі, арганізацыя новага прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы не знайшлі адпаведнага праламленьня ў практычнай рабоце Глівінскай ячэйкі. Ячэйка яўна недаацаніла палітычнага значэньня работы з батрацтвам і беднатой, не змагалася з апартуністычнымі настроямі наасобных камуністаў у гэтым пытаньні. Характэрна паказаць на тое, што **падрыхтоўка да вясновай пасеўнай кампаніі ні ў адным з калгасаў, якімі кіруе ячэйка, як належыць, не разгорнута** — не адрамантаваны інвэнтар, ня скончана ачыстка насеньня, не праграцаваны вытворчыя пляны і інш.

Для таго, каб знайсьці прычыны такога становішча работы з беднатой і падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі, трэба некалькі азнаёміцца са становішчам ячэйкі і кіраўніцтвам сю з боку Барысаўскага райкому партыі.

У калгасе «Шлях Леніна» кулацкія элементы разгарнулі шырокую работу супроць падрыхтоўкі да вясновай пасеўнай кампаніі, узялі над сваёй уплыў наасобныя групы беднякоў і сераднякоў і прывялі калгас амаль да поўнага развалу. Партыйная ячэйка не мабілізавала калгаснікаў для адпору варожым элементам, не ачысьціла калгас ад лодзей, якія былі раскулачаны і змаглі пры садзейнасьці апартуністаў з партыйнымі білетамі ў кішэні праледзіці ў калгас. Такое становішча назіраецца і ў радзе іншых калгасаў. У калгасе «Чырвоны дуб» да сёпешняга дня «працуюць» былыя кулакі, сучасныя «бедныкі і маламоцныя сераднякі» (Каборцкі, Саўрыцкі і г. д.). У гэтым-жа калгасе ў часе пабудовы аборы старэйшым брыгадзірам быў прызначан **Дрыгановіч**, якога ня так даўно раскулачылі. Дрыгановіч прымаў усе захады, каб адцягнуць пабудову аборы да вясны з мэтай ухіліцца ад абагуленьня рабочай і прадукцыйнай жывёлы. Характэрна, што партыйная ячэйка рэкамэндавала ў намесьнікі старшыні праўленьня калгасу «Чыр. дуб» кулака Ёрдана.

Кіраўніцтва калгасам «Правда» знаходзіцца ў руках баптыста Вярбіцкага, які ўпарта імкнецца абярнуць калгас у контр-рэвалюцыйную сэкту. У радзе калгасаў у якасьці кіраўнікоў і членаў праўленьня знаходзяцца раскулачаныя і нераскулачаныя кулакі і заможнікі. У сувязі з гэтым былыя бедныкі ў радзе калгасаў экспамічна загнаны, яны зарабляюць па 150-200 руб., а былыя кулакі—на 1.000 - 1.600 руб.

Такое становішча большасьці калгасаў сельсавету зусім невыпадковае.

Партыйная ячэйка не заўважыла, што кулацка-заможныя элементы прымаюць усе захады, каб сарваць вясновую пасеўную кампанію, каб разбурыць калгасы з сярэдзіны.

Ячэйка бальшавіцкае змаганьне супроць клясавага ворага, справу арганізацыі беднаты, батрацтва і серадняковаў па ўзмацненьню калгасаў, на прасоўваньне лепшых ударнікаў з беднаты і серадняковаў у праўленьні калгасаў замяніла апартуністычная практыкай і палітычнай бязьдзейнасьцю.

Невыпадковым зьяўляецца і тое, што ячэйка ў часе перавыбарчай кампаніі сельсавету рэкамэндавала ў склад сельсавету кулакоў **Брыда, Дрыгановіча**, якія пры дапамозе апартуністычнага кіраўніцтва ячэйкі былі праведзены ў члены сельскага савету.

Ячэйка да гэтага часу трымае ў сваіх радох такіх людзей, як Небашынец, Яксэвіч і Вяжавы, якія канчаткова адмовіліся ад выкананьня генэральнай лініі партыі, перайшлі ў лягер клясавага ворага і разам з ім змагаюцца супроць калгасаў, супроць сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы. Гэта група апартуністаў дапамагла кулакам і заможнікам праледзіці ў калгасы, дапамагала разбураць калгасную гаспадарку і зрываць выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы.

Апартуністы з посьпехам праводзілі сваю падрыўную работу толькі з таму, што абсалютна адсутнічала сімакрытыка ў сельсавеце і ў ячэйцы. Калі беспартыйныя настаўнік і настаўніца выпусьцілі насьценную газэту, у якой быў зьмешчан рад заметак аб апартуністычнай дзейнасьці Небашынца і інш., Небашынец (ён-жа член бюро ячэйкі) і інш. распачалі цкаваньне настаўнікаў, грамадзкіх работнікаў і катэгарычна патрабавалі распусьціць рэдкалегію «з-за не непатрэбнасьці». у нас, бачыце, няма аб чым пісаць.

Нарэшце, трэба паказаць на тое, што апартуністы разбурали партыйную ячэйку, зьмяншалі не балядольнасьць і цягнулі ў апартуністычнае балота пры поўнай садзейнасьці Барысаўскага райкому партыі. Гэта выявілася ў тым, што райком да апошніх дзён лічыў Глівінскую ячэйку аднэй-з найбольш моцных у раёне, аднэй з найбольш здольных выконваць генэральную лінію партыі.

Становішча Глівінскай партыйнай ячэйкі выразна гаворыць за тое, што Барысаўскі райком ня здолеў перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у адпаведнасьці з новымі абставінамі жорсткага клясавага змаганьня на вёсцы. Райком з вялікім спазьненьнем рэагаваў на вялізарнае скажэньне лініі партыі апартуністамі з Глівінскай ячэйкі, чым па сутнасьці на працягу поўнага пэрыяду выказваў сваю згоду з апартуністычнай дзейнасьцю ячэйкі.

Б. ЗЕЙФМАН.

Абвясьцілі сябе ўдарнікамі

СМАЛЯВІЦКІ РАЙКОМ ПАРТЫІ ў сьнежні праёў канфэрэнцыю груп беднаты з удзелам калгаснікаў. Канфэрэнцыя абгаварыла чарговыя задачы партыі ў вёсцы і ўдзоле беднаты ў іх ажыцьцяўленьні.

На канфэрэнцыі з выступленьняў дэлегатаў выявілася, што значная частка партыйных ячэек, прызнаючы неабходным разгортваць работу сярод беднаты, прымаючы па гэтым пытаньні дзесяткі пастаноў, у той самы час груба парушае і ігнэруе дырэктывы партыі аб узьняцьці работы сярод беднаты на палітычную вышыню.

У спрэчках выказалася больш 20 беднякоў, якія ў сваіх выступленьнях запэўнілі райком партыі аб гатоўнасьці рашуча змагацца за пасьпяховае правядзеньне другой калгаснай вясны.

Канфэрэнцыя абавязалася намагчы ўсе сілы на гаспадарчае і арганізацыйнае замацаваньне калгасаў, на арганізацыю працы і вырашэньне праблемы жывёлагадоўлі.

32 БЕДНЯКІ-КАЛГАСЬНІКІ НА КАНФЭРЭНЦЫІ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў ЛЕНІНСКУЮ ПАРТЫЮ.

КАНФЭРЭНЦЫЯ ПРЫНЯЛА ПАСТАНОВУ АБ АДВЯШЧЭНЬНІ БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКІХ ГРУП УДАРНЫМІ ПА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНІ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ КАМПАНІІ.

М. САВІЦКІ.

Правалілі

правядзеньне канфэрэнцыі беднаты

КІРАЎНІЦТВА ЮРАВІЦКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПЕДАПУСЬЦІЛА ВЕЛІЗНАЕ ПАЛІТЫЧНАГА ЗНАЧЭНЬНЯ РАБОТЫ З БЕДНАТОЙ. ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ НЕ ЎЗЬНЯЛІ НА ВЫШЭЙШЮ ПАЛІТЫЧНЫХ ЗАДАЧ КІРАЎНІЦТВА ГРУПАМІ БЕДНАТЫ, НЕ СКАРЫСТАЛІ БЯДНЯЦКАГА АКТЫВУ ДЛЯ ВЫЯЎЛЕНЬНЯ КУЛАЦКІХ ГАСПАДАРАК, ЯКІЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ АПАДАТКАВАНЫ Ў ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ ПАРАДКУ. АБ ГЭТЫМ КРАСАМОЎНА ГАВОРЫЦЬ ТОЙ ФАКТ, ШТО Ў РАЁНЕ НЯ ВЫЯЎЛЕНА НІВОДНАЙ КУЛАЦКАЙ ГАСПАДАРКІ.

ТОЕ, ШТО РАБОТА З БЕДНАТОЙ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ЗАНЯПАДЗЕ, ШТО КІРАЎНІЦТВЫ АСОБНЫХ ЧЭЕК ГРУБА ІГНАРУЮЦЬ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ АБ ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОЦЕ СЯРОД БЕДНАТЫ, ПАЦЬВЯРДЖАЕЦЦА ФАКТАМІ ЧЫНОЎНІЦКІХ ДЗЯЛЬЦКІХ АДНОСІН РАЙКОМУ ПАРТЫІ ДА ГЭТАЙ СПРАВЫ.

У СЬНЕЖНІ МЕСЯЦЫ БЫЛА СКЛІКАНА КАНФЭРЭНЦЫЯ ГРУП БЕДНАТЫ, НА ЯКУЮ ЗЬЯВІЛІСЯ 24 БЕДНЯКІ. РАБОТНІКІ РАЙКОМУ ЗНАЙШЛІ, ШТО 24 ЧАЛАВЕКІ — ВЕЛЬМІ МАЛАЯ КОЛЬКАСЬЦЬ, З ЯКОЮ НЕЛЬГА ПРАВОДЗІЦЬ КАНФЭРЭНЦЫЮ. КАНФЭРЭНЦЫЯ БЫЛА САРВАНА.

ЗН.

АПЭРАЦЫЙНЫЯ ЗВОДКІ БАРАЦЬБЫ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Пабудова мастоў пад пагрозай зрыву

ПАБУДОВА МАСТОЎ З-ЗА НЯДБАЙНЫХ АДНОСІН КІРАЎНІЦТВА САЮЗЛЕСПРАМУ ЗНАХОДЗІЦЦА ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ. НА 1931 ГОД ГАЛОЎДАРТРАНСУ ПАТРЭБНА МІНІМАЛЬНА 120 ТЫСЯЧ КУБА-МЭТРАЎ КРУГЛАГА ЛЕСУ. САЮЗЛЕСПРАМ ПАТРАБАВАЎ ДАЦЬ ЯМУ ВЕСТКІ, У ЯКІХ РАЁНАХ БУДЗЕ ПРАХОДЗІЦЬ ВУДАЎНІЦТВА, З ТЫМ, КАБ ВЫЗНАЧЫЦЬ ДЛЯ ЗАБЕСПЯЧЭНЬНЯ ЛЕСАМ АДПАВЕДНЫЯ ЛЕСПРАМРАСЫ. КАЛІ ВЕСТКІ БЫЛІ ПАДАНЫ, ТАВ. АРДАШНІКАЎ АДКАЗАЎ, ШТО ЯКІХ ФОНДАЎ ЯШЧЭ НЯМА І ТАМУ ЁН ЗАБАРАНЯЕ ПАДРЫХТОЎКУ ЛЕСУ.

МЫ БЕМ ТРЫВОГУ, КАЛІ НЯ БУДУЦЬ УЖЫТЫ МЕРЫ ДЛЯ ЗАГАТОЎКІ ЛЕСУ, БЕЛДАРТРАНС НЯ ЗМОЖА ВЫКАНАЦЬ СВОЙ ПРАМФІНПЛЯН, ЧАСУ-Ж ДЛЯ ЛЕСАЗАГАТОВАК ЗАСТАЛОСЯ ВЕЛЬМІ МАЛА.

ВЫЛУЧЭНЕЦ БЕЛДАРТРАНСУ А. ЖОМАЙЦІС.

Пачатак—кепскі

ВІЦЕБСКАЯ АКУЛЯРНАЯ ФАБРЫКА ЗА ПЕРШУЮ ДЗКАДУ СТУДЗЕНЯ ВЫКАНАЛА ПРАГРАМУ НА 78,37 ПРОЦ. ГАНЕБНА АДСТАЮЦЬ І ЗРЫВАЮЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ—ШЛІФАВАЛЬНЫ ЦЭХ, ВЫКАНАЎШЫ ПРАГРАМУ НА 43 ПРОЦ., ЦЭХ ФІТЦУ (ПЭНСНЭ)—57 ПРОЦ. І ЗБОРАЧНА-АПТЫЧНЫ—33 ПРОЦ. У ШЛІФАВАЛЬНЫМ НЯМА ПЛЯНАВАСЬЦІ, ШТОДЗЕННА ЛАМАЮЦЦА МАШЫНЫ, А МЭХАНІЧНЫ ЦЭХ НЕ ПАСЬПЯВАЕ РАМАНТАВАЦЬ ІХ.

Рыхтавацца да ленінскіх дзён

Ленінскія дні — 7 гадавіну з дня сьмерці арганізатара і вялікага правадыра камуністычнай партыі, вялікага правадыра пралетарыяту і прыгнечаных усяго сьвету—Уладзімера Ільліча Леніна краіна пралетарскай дыктатуры сустракае з вялікімі посьпехамі на фронце змаганьня за перамогу сацыялізму.

На аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня адзіна правільнай генэральнай лініі партыі, шпаркімі тэмпамі разьвіваецца сацыялістычная цяжкая індустрыя. Гэта, як ня трэба лепш, характарызуецца тым, што за першыя два гады пяцігодкі цяжкая індустрыя дала краіне прадукцыі на 13,8 млрд. руб., між тым, як наводле пяцігодовага пляну меркавалася атрымаць толькі 12,5 млрд. руб.

Цяжкая індустрыя, якая адыгрывае вядучую ролю ва ўсёй народнай гаспадарцы СССР, дазволіла партыі шырока разгарнуць справу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, перайсьці ад лёзунгу абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулака да ліквідацыі кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі. На базе арганізацыі буйных саўгасаў, на базе перавыкананьня ў два разы заданьняў пяцігодкі па калектывізацыі сельскае гаспадаркі, партыя ў асноўным вырашыла збожжавую праблему. Удзельная вага аграмаджанага сэктару ў таварнай прадукцыі збожжа ў мінулым годзе складала каля 50 проц. усяе таварнае прадукцыі.

Нябывала вырасла актыўнасьць рабочых мас.

У краіне дыктатуры пралетарыяту сацыялістычны сэктар заняў абсалютна пераважаючую ролю ў народнай гаспадарцы. Краіна ўступіла ў пэрыяд сацыялізму. Бягучы год будзе годам завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.

Партыя бальшавікоў прывяла пралетарыят і працоўныя масы бядняцка-серадняцкага сялянства да грандыёзных посьпехаў у будаўніцтве сацыялізму толькі таму, што з усёй бальшавіцкай пасьлядоўнасьцю і няўхільна праводзіла ў жыцьцё наказы свайго правадыра Леніна. Партыя набыла гігантскія посьпехі ў справе сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце толькі таму, што вяла бязьлітаснае змаганьне **супроць ухілаў ад ленінізму і ў першую чаргу супроць найбольш небясьпечнага на даным этапе правапартуністычнага ўхілу, супроць «левых» загібаў і бясприцыпнага прымірэнцтва, толькі таму, што нанесла руйнуючы ўдар па права-«лявацкім» блёку, дашчэнту разьбіла контр-рэвалюцыйны трацкізм.**

КП(б)Б, як адзін з атрадаў УсеКП(б), набыла вялікія посьпехі ў справе ажыцьцяўленьня **ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР.** Яны (гэтыя посьпехі) набыты КП(б)Б толькі таму, што ўся партыйная арганізацыя Беларусі вяла бязьлітаснае змаганьне супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе ў правядзеньні нацыянальнай палітыкі, разграміла беларускі контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм, не аслабляючы змаганьне супроць шавінізму усіх колераў.

Ленінскія дні гэтага году партыя, пралетарыят, калгаснікі і бядняцка-серадняцкія масы сялянства будуць праводзіць пад лёзунгам выкананьня пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), пад знакам поўнага і пасьпяховага выкананьня баявой праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Як і ў першыя дні пасьля сьмерці Леніна, калі рабочая клясa паказала сваю цьвёрдую рашучасьць у справе давядзеньня да канца пралетарскай рэвалюцыі, якой аддаў усё сваё жыцьцё Ленін, так і зараз ленінскія дні зьяўляюцца днямі дэманстрацыі гатоўнасьці змагацца за выкананьне ленінскіх наказаў, за ўзмацненьне змаганьня супроць капіталізму.

Ленінскія дні—**дні баявой мабілізацыі найшырэйшых мас на выкананьне праграмы разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце.** У гэтыя дні перад кожнай партарганізацыяй і кожнай ячэйкай павінна ва ўсю шырыню паўстаць задача вярбоўкі ў партыю перадавых ударнікаў пралетараў, сельска-гаспадарчых рабочых, батракоў і калгаснікаў, якія паказалі сябе стойкімі змагарамі супроць кулацтва. У ленінскія дні партыя напоўніцца новымі сотнямі перадавых барацьбітоў за перамогу сацыялізму. Ленінскі камсамол павінен даць лепшых сваіх таварышоў партыі Леніна.

Пралетарыят Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам партыі, няўхільна ажыцьцяўляе думкі Леніна аб **сацыялістычным спаборніцтве**, аб новых адносінах да працы і да вытворчасьці. У ленінскія дні **ударныя брыгады** папоўняцца новымі тысячамі адданых справе сацыялізму пралетараў і калгаснікаў, сацыялістычнае спаборніцтва ўзьнімецца яшчэ на вышэйшую ступень і будзе накіравана на змаганьне за якасьць прадукцыі, за больш высокую прадукцыйнасьць працы. **Новыя ўдарныя брыгады** ў ленінскія дні павінны ўключыцца ў агульны фронт змаганьня за поўнае выкананьне баявой праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

У ленінскія дні партыйныя арганізацыі павінны ў некалькі раз узмацніць сваё змаганьне за ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі аб суцэльнай **калектывізацыі**. Па меры разгортваньня падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны, бядняцка-серадняцкія масы сялянства ўсё больш становяцца на шлях калектывізацыі. Вядучы бязьлітаснае змаганьне супроць усякіх спроб і імкненьняў падмяніць лёзунг суцэльнай калектывізацыі іншымі, апартуністычнымі лёзунгамі, кожная партыйная ячэйка павінна ў поўным сэнсе гэтага слова стаць на чале новага калгаснага прыліву, усямерна разгортваючы работу з тым, каб **ленінскі калгасны прызыў** ахапіў сабою новыя сотні і тысячы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Ленінскі калгасны прызыў узмоцніць фронт калгаснага будаўніцтва, узмоцніць фронт бязьлітаснага змаганьня бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, пад кіраўніцтвам партыі, супроць кулацтва да поўнай яго ліквідацыі як класы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Органы пралетарскай дыктатуры — **саветы** прыступілі на аснове пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) да перабудовы сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду, з задачамі ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі. Ва ўсёй гэтай работе павінны быць шырока ператвораны ў справу думкі Леніна аб апараце Савецкай краіны, аб змаганьні з бюракратызмам і цяганінай, якія тармозяць справу палепшэньня гібкасьці і працаздольнасьці дзяржаўнага апарату.

Партыйныя, прафсаюзныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі павінны заразжа разгарнуць шырокую падрыхтоўку да ленінскіх дзён. Правядзеньне сёмай гадавіны з дня сьмерці Леніна павінна быць **мабілізуючым фактарам у выкананьні і пасьпяховым правядзеньні асноўных палітычных і гаспадарчых кампаній.**

Змагаючыся за пралетарскую баяздольнасьць саветаў, партыйныя арганізацыі павінны ня ўхільна мабілізаваць масы батракоў, калгаснікаў, беднаты і серадняковаў на аднаўленьне органаў пралетарскай дыктатуры ад сацыяльна-варожых і клясава-чужых элементаў. Апартуністы, кулакі і падкулачнікі павінны быць бесспаваротна выгнаны з саветаў. Клясавая пільнасьць саветаў, асабліва на вёсцы, павінна быць узьнята на вышэйшую палітычных задач рэканструкцыйнага пэрыяду.

Ленінскія дні пададуць партыі і пралетарыяту яшчэ больш сіл і творчага энтузіязму, якімі быў так багаты Уладзімер Ільліч. Пад кіраўніцтвам свайго авангарду, пралетарыят прыложыць яшчэ больш сіл у змаганьні за перамогу сацыялізму, у змаганьні супроць правага і «левага» апартунізму, у змаганьні за поўнае завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР у бягучым, трэцім годзе пяцігодкі. Партыйныя масы з яшчэ большай непрымірымасьцю будуць змагацца за ленінскую генэральную лінію партыі, пад ленінскім кіраўніцтвам — ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Разьвіваючы пераможнае сацыялістычнае наступленьне, руйнуючы супраціўленьні клясавых ворагаў, кулакоў і інш. сацыяльна-варожых элементаў, пралетарыят, пад кіраўніцтвам партыі, яшчэ больш узмоціць абароназдольнасьць бацькаўшчыны пралетарыяту ўсяго сьвету, яшчэ больш узьнімае баявую магутнасьць Чырвонай арміі,—верная апора і вартаўніка сацыялістычнага будаўніцтва СССР.

Рэсурсы ёсьць, іх трэба толькі пашукаць

РАБОЧЫЯ ВІЦЕБСКАГА ЗАВОДУ «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ» ПАЧАЛІ ПРАПРАЦОЎКУ ПРАМФІНПЛЯНУ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ ТРЭЦЯГА ГОДУ, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА НАПРУЖАНАЕ СТАНОВІШЧА З СЫРЦОМ. РАБОЧЫЯ ВЫСОЎВАЮЦЬ СУСТРЭЧНУЮ ПРАГРАМУ: ПА ВЫПУСКУ ТОЧАК ЗАМЕСТ 2.250 ШТУК РАБОЧЫЯ ПРАПАНУЮЦЬ 3.000, ЗАМЕСТ 2.500 БАРОН «ГАНК-МО» — 3.250, ЗАМЕСТ 1.500 КОРНЯРЭЗАК — 2.000 ШТУК І Г. Д.

**АДНАЧАСОВА, УЛІЧВАЮЧЫ НЕДАХВАТ СЫРЦУ, РАБОЧЫЯ ЎЗЯЛІСЯ ЗА МАБІЛІЗАЦЫЮ ЎНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ. ТЭХНІЧНАЯ НАРАДА ПЛІСЭРНАГА ЦЭХУ ГЭТЫМІ ДНЯМІ ВЫЯВІЛА МАГЧЫМАСЬЦЬ ЗКАНОМІЦЬ ШТОДЗЕННА КАЛЯ 30 ПУДОЎ ЧУШКАВАГА ЧЫГУНУ ШЛЯХАМ ЗЬНІШЧЭНЬНЯ РАЗЬЛІВАНЬНЯ ЧЫГУНУ ЗА АПОКІ, ШТО МЕЛА МЕСЦА ДА ГЭТААГ ЧАСУ. ПАМЯНШЭНЬНЕ ЛІЦЕЙШЧЫКАЎ І Г. Д. РАБОЧЫЯ СЬЛЯСАРНА-МОХАНІЧНАГА ЦЭХУ 10 СТУДЗЕНЯ АДДАЛІ 2 ГАДЗІНЫ НА РАЗБОРКУ РО

„Сакрэт“ прарываў на БАБРУЙСКІМ КАМБІНАЦЕ

Замест выразнага плянаваньня—апартуністычны самацёк

Рацыяналізацыя ў заняпадзе, прапановы рабочых ня выконваюцца, улік работы пастаўлен дрэнна, сацспаборніцтва і ўдарніцтва не карыстаюцца належнай увагай заводзкіх арганізацый

Узмацніць кіраўніцтва, ударыць па апартунізьме на практыцы

Бяспрытульны гігант

Радам партыйных і ўрадавых дырэктыў з поўнай выразнасьцю вызначаны арганізацыйныя занатрабаваньні, якім павінна адпавядаць кіраўніцтва нашай сацыялістычнай прамысловасьці.

З практыкі бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату відаць, што ў справе ажыцьцяўленьня такіх дырэктыў, як церавод цэхаў на гаспадарчы разрахунак, павялічэньне правоў і самастойнасьці цэхаў, укараненьне адзінаначаньня і адказнасьці за выконваную працу, узмацненьне тэхнічнага кіраўніцтва, давядзеньне прамфінпляну да рабочага месца,—зроблена надзвычай мала.

Адміністрацыя камбінату і лесаабʼяднаньня не паставіла ва ўсю шырыню пытаньня аб прыстасаваньні сыстэмы кіраўніцтва да занатрабаваньняў рэканструкцыйнага перыяду нашай гаспадаркі.

Блытаніна ў структуры

Сучаснае становішча па камбінаце ў галіне тэхнікі кіраўніцтва вытворчасьцю трэба характарызаваць, як катастрафічнае.

Вытворча-тэхнічны аддзел не ўкамплектован, а тыя таварышы, якія працуюць, займаюцца не сваёй справай. Замест тэхнічнага кіраўніцтва, нагляду і кансультацыі цэхам у ходзе тэхналёгічнага працэсу тэхнічны аддзел займаецца пытаньнямі дастаўкі апалу па электрастанцыю, рэгуляваньнем працы тужавога транспэрту і інш. гаспадарча-забесьпечальнымі функцыямі. У працы тэхнічнага аддзелу не знайшлося месца для барацьбы за добрую якасьць прадукцыі, яўсім не наладжан кантроль і нагляд за якасьцю прадукцыі.

На існуючай структуры вытворча-тэхнічнаму аддзелу надпарадкаван загадчык адгрузак са штатам экспэдыцыі піламатар'ялаў, у той час, як па сваім вымесьце функцыі адгрузак ня маюць нічога агульнага з вытворча-тэхнічным аддзелам. Тое самое трэба сказаць і ў адносінах да штату па выкананьні заказаў, які таксама лічыцца пры вытворча-тэхнічным аддзеле.

Частка супрацоўнікаў камбінату ня ведаюць да якога аддзелу яны належаць і каму падпарадкаваны. Тэхнікі-будаўнікі, які па сутнасьці зьяўляюцца прарабам на камбінаце, згодна зацьвярджанай структуры лічыцца пры гаспадарча-забесьпечальным аддзеле, на практыцы будуюць сваю работу вядзе галоўны кіраўнічы тэхнарука, а падпарадкаван непасрэдна дырэктару.

Тыя факты, што на камбінаце да гэтага часу нікодзіць, хто павінен займацца сьвяточнымі забесьпечальнымі электрастанцыі аналам, што тэхнічны кіраўнік нярэдка пакладкі гужавога транспарту, што тэхнічны аддзел кіруе працай адгрузак гатовых вырабаў, што нікому ня прыкладаюцца функцыі рацыянальнага скарыстаньня абсталяваньня (як у цэхах, так і на складзе,—усё гэта сьведчыць аб поўнай адсутнасьці размежаваньня функцый паміж часткамі і подсобнымі прадпрыемствамі камбінату.

У выніку такога становішча няма вінаватых канкрэтным выпадку вызначыць асоб, якія адказваць за тое ці іншыя непаладкі на вытворчасьці. Такая арганізацыйная блытаніна і зьяўляецца галоўнай прычынай значнага недавыкананьня вытворчых праграм камбінату за асобны квартал.

З найбольш дэзарганізаваным вучасткам камбінату зьяўляецца беларэўны цэх. Адсутнасьць увязкі паміж асобнымі варштатамі, непаладжанасьць тэхнічнага кантролю і інструктажу рабочых, кепская працаздольнасьць—даюць у выніку каля 65 проц. браку гатовай прадукцыі. Адсутнасьць нагляду і нагляду за своечасовым прасоўваньнем поўных комплектаў дэталей да зборкі прыводзіць да прастояў рабочых і абсталяваньня, зьмяшаньня аддзяленьня.

Абураючая безгаспадарчасьць

ВСНГБ, а таксама і лесаабʼяднаньне прынялі абсалютную бязьдзейнасьць у справе забесьпечаньня камбінату адпаведнай колькасьцю тэхнічнага парсаналу. Электрастанцыя магутнасьцю ў 3½ тыс. кін. ня мае ні адзінаго інжынэра-электрыка і цеплатэхніка. Камбінат ня мае галоўнага інжынэра, які-б мог сапраўды кіраваць вытворча-тэхнічным працэсам слімі буйных прадпрыемстваў з колькасьцю рабочых каля 3-х тыс. чал. Недапушчальным зьяўляецца і тое, што ні адзін з цэхаў ня мае тэхнолёга.

Вузкім месцам на камбінаце зьяўляецца парасілавая гаспадарка. Электрастанцыя і канцельная не адпавядаюць запатрабаваньням асноўных цэхаў, з прычыны чаго парушаецца ход вытворчасьці, а беларэўны цэх з-за недахвату пары прымушан працаваць з нагрузкай у 50 проц.

Такое становішча з парай назіралася на працягу абопага кварталу, але ні з боку адміністрацыі камбінату, ні з боку лесаабʼяднаньня рашучых мер да зьнішчэньня ня прымалася.

За апошні час на камбінаце быў рад камісій ад лесаабʼяднаньня і Экспартлесу, але, на жаль, яны не далі ніякіх канкрэтных прапаноў для зьнішчэньня недахопаў. Апошняя камісія лесаабʼяднаньня ў складзе інжынэраў Бромбэрга, Сульскага і інш., якая займалася спэцыяльна пытаньнем парасілавай гаспадаркі, не дала кіраўніцтву камбінату належных паказаньняў для пераабсталяваньня электрастанцыі. Адсутнасьць сартаваньня драўніны на месцы сплаву прыводзіць да таго, што сартаваньне на рэчцы каштуе ў некалькі раз даражэй, а кежка адсартаваны матар'ял значна памяншае выхад піламатар'ялаў і дэзарганізуе плянагасьць працы лесацэху.

Як факт абсалютнай безгаспадарчасьці і безадказнасьці можна прыпесьці тое, што камбінат да гэтага часу ня ведае кошту яго маемасьці. **Па балянсе лічыцца маемасьці на 800.000 руб., замест 11—12 міл.** Адсюль, зразумела, направільна амартызуецца маемасьць, а ў выніку няма магчымасьці дасканала ўстанавіць сабекошт адзінкі гатовага вырабу. За апошнія тры гады ня зроблен капчатковы разьлік з рабочымі, запазычанасьць за рабочымі складае некалькі дзесяткаў тысяч руб., з якіх значная частка ня можа быць рэалізаванай. На некаторых прадпрыемствах інвэнтарызацыя маемасьці не праведзена з 1926 году. Існуючы ўлік на камбінаце ні ў якім разе не адпавядае запатрабаваньням вытворчасьці, не дае характарыстыкі дзейнасьці прадпрыемства і не выяўляе слабых вучасткаў працы.

70.000 руб. золатам— у мертвым капітале

Барацьба за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў амаль не вядзецца. Больш году на складах ляжыць імпартнае абсталяваньне (коштам больш 70 тыс. руб. золатам), якое ня можа быць скарыстана ва ўмовах камбінату, але аб скарыстаньні гэтага абсталяваньня на іншых прадпрыемствах з боку абʼяднаньня ніякіх захадаў не рабілася. Варштаты і розныя прылады не разьмеркаваны паміж паасобнымі прадпрыемствамі. У выніку некаторыя цэхі адчуваюць вялікую патрэбу ў абсталяваньні, якое ёсьць на іншых прадпрыемствах, і там не скарыстоўваецца.

Мэханічная майстэрня з-за адсутнасьці належнага абсталяваньня, ня можа задаволіць запатрабаваньніў на капітальным і бягучым рамонце цэхаў. У выніку камбінат мае значныя тэхнічныя прастоі.

Прафарганізацыі камбінату і цэхаў ня здолелі мабілізаваць рабочых масы на ліквідацыю прарываў па выкананьні прамфінпляну і розных арганізацыйных непаладак. На апошняй вытворчай нарадзе камбінату прысутнічала замест некалькіх соцень чалавек усяго 15-20 рабочых. Кіраўнікі некаторых прафцэхкамітэтаў на гэтай нарадзе выказвалі думку, што «ў сучасны момант на камбінаце няма вакол чаго мабілізаваць рабочыя масы» (?).

Вось тыя асноўныя недахопы, якія патрабуюць з боку кіраўніцтва камбінату, лесаабʼяднаньня і ВСНГБ прыняцьця самых рашучых мер.

Толькі пры ліквідацыі адзначаных агідненькіх арганізацыйных і тэхнічных непаладак пры ўмове рашучай барацьбы з анархізмам на практыцы бабруйскі камбінат зможа канчаткова зьнішчыць спадчыну старых прарываў, поўнасьцю забясьпечыць бязмоўную магчымасьць выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну 3-га году пяцігодкі.

А. ШАЎРОЎ.

Хаос на біржы піламатар'ялаў

Біржа піламатар'ялаў зьяўляецца складам на прыёме, хаваньні і адпраўцы гатовай прадукцыі лесацэхаў. Тут, на чыгунцы штодзённа робіцца нагрузка і адпраўка ад 20 да 45 вагонаў розных гатункаў дошак, якія развозяцца, як на усім СССР, так і за мяжу (экспарт).

Да гэтага часу мы маем рад недахопаў тэхнічнага і арганізацыйнага парадку, якія не даюць магчымасьці біржы наладзіць работы.

Біржа ня мае выразнага расплянаваньня і не разьмеркавана на паасобныя вучасткі (хаваньне піламатар'ялаў, мясцовы рынак і экспарт). На біржы ёсьць каля 300 вагонаў піламатар'ялаў, якія не адпраўляюцца з прычыны непадачы вытарчальнай колькасьці вагонаў і направільнага скарыстаньня рабочай сілы. Напрыклад, калі падаюцца ў вытарчальнай колькасьці вагоны, тады не хапае рабочай сілы і наадварот.

Пляхі біржы, па якіх падвозяцца на аўтавозах піламатар'ялы, надта вузкія. Да некаторых месц складу зусім няма шляхоў. Пляцоўкі для падвозкі дошак да рамы для нагрузкі ў вагоны дрэнна забрукаваны, у выніку чаго аўтавоз ня можа даяжджаць да месца адгрузкі. Дошкі раскладваюцца ня ў парядку, з прычыны чаго выдаткоўваюцца значныя сродкі на перавозку ад шляхоў да рамы кужавым нарадкам і на подачу для ўкладкі, што каштуе замест 1 рубля — 10 руб. вагон. Дошкі загрэбваюцца шляхі біржы, ламаюцца і псуюцца.

Колькасьць аўтавозаў здольных патрасаваць біржы.

Для ўкладкі экспартных дошак у штабелі ёсьць дзве мэханізаваных штабельных машыны, якія невыстарчальна скарыстоўваюцца таму, што пельга іх перасоўваць па вузкіх шляхох біржы.

Асноўным недахопам, які дэзарганізуе работу біржы, зьяўляецца тое, што дошкі па сартовачнай лесацэху не раскладваюцца па адпаведных гатунках пры адпраўцы іх на біржу. Таму піламатар'ялы павінны напоза сартавацца, для чаго патрэбна шмат рабочай сілы.

Ёсьць ударныя брыгады ўкладчыкаў, бракераў і інш., але няма ўліку іх работы.

Аб тым, які ўплыў мае непармальная работа біржы на работу лесацэху сьведчыць той факт, што калі замяно сьпегам шляхі біржы і аўтавозы бяжавалі і не маглі перавозіць піламатар'ялаў,—сартовачнай лесацэху дошкі складаліся ў самым хаотычным беспарадку. Трэба канстатаваць, што пры біржы няма мэханізаванага сьпегаачысьцільніка і неачыстка шляхоў заўсёды ставіць над пагрозу зрыву ўсю работу лесацэху.

Гэлер.

Лесааб'яднаньне маўчыць

Ёсьць у Хойніках завод «Адраджэньне». Завод мае паркетны цэх — адзіны ў БССР. Але і гэты цэх знаходзіцца пад пагрозай спыненьня.

Месяцаў два таму назад заводакіраўніцтва паведаміла лесаабʼяднаньне аб недахвацe сырцу — фрызы. Лесаабʼяднаньне бюракратычна адпісалася, прапанаваўшы сваім заводам, якія выробляюць фрызу, адгрузіць на завод патрэбную колькасьць сырцу. І больш лесаабʼяднаньне гэтым пытаньнем ня цікавілася.

Заводакіраўніцтва камандыравала рабочага шукаць фрызы. Аказалася, што толькі на адным заводзе ёсьць каля 10 вагонаў, якія пакуль што на завод не адгружаюцца.

Два тыдні назад завод тэлеграфна паведаміў лесаабʼяднаньне, што паркетны цэх ня мае сырцу. Адказу ня было.

РСІ павінна зацікавіцца гэтым пытаньнем і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых.

ВЕДАЮЧЫ.

22, 2% ПРАГРАМЫ

Ударны квартал ня даў станоўчых вынікаў у выкананьні прамфінпляну беларэўным цэхам. Праграма выканана толькі на 22,2 проц. З гэтай колькасьці атрымалася больш 80 проц. браку.

Чым выклікан такі ганебны прарыў?

Адміністрацыя цэху і камбінату тлумачыць гэты прарыў «аб'ектыўнай прычынай — адсутнасьцю сухіх дошак для цэху. Бязумоўна, значная частка віны надае на электрастанцыю, якая не давала вытарчальнай колькасьці пары ў сушні, але-ж лічба — 80 проц. браку, які атрымаўся ў выніку цэлага ряду недахопаў у самым цэху, не дае магчымасьці тлумачыць прарыў толькі гэтай прычынай.

Вытворчая нарада рабочых беларэўнага цэху 19 сьнежня выкрывае сапраўдныя прычыны прарыву. Адзначана, што ў цэху **адсутнічае тэхнічнае кіраўніцтва**, не пастаўлен кантроль за якасьцю прадукцыі, няма інструктажу рабочых (большасьць якіх складае моладзь), да гэтага часу не ўстаноўлена прадукцыйнасьць абсталяваньня, не арганізаваны плянавае і рацыяналізатарскае бюро. Працоўная дысцыпліна зусім занепала. **Ёсьць факт, калі рабочы адмовіўся выканаць распараджэньне майстра.** Адміністрацыя да гэтага часу не правяла ў жыцьцё ні аднэй прапановы рабочых.

Ня гледзячы на наяўнасьць вялікага прарыву, цэхавыя арганізацыі, у прыватнасьці прафкомы, ня толькі ня ўжылі рашучых захадаў да ліквідацыі прарыву, але нават не мабілізавалі ўвагі рабочай грамадзкасьці. Больш таго, на агульнакамбінацкай канфэрэнцыі ўдарнікаў старшыня цэхкому т. Канчаноў у сваім выступленьні адзначаў, што «ў сучасны момант няма вакол чаго мабілізаваць масу». Такую-ж думку выказаў і старшыня цэхкому лесазаводу № 6. На практыцы гэта пераламлялася ў тым, што за ўвесь час працы цэху — **8 месяцаў** — адбыліся ўсяго 2 вытворчыя нарады. Сацспаборніцтва ў цэху зусім не адчуваецца, вельмі слаба ідзе арганізацыя ўдарных брыгад.

Усё гэта стварае пагрозу зрыву прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Час ужо прафарганізаваць цэху і камбінату павярнуцца тварам да вытворчасьці.

В. Б.

Набліжаецца фініш усебеларускай культэстафэты

КУЛЬТ-МАСАВАЯ РАБОТА НА ПРАДПРЫЕМСТВЕ— *важнейшы маршрут*

ВОПЫТ КЛЮБУ МЕНСКІХ ДРУКАРОЎ І ЗАВОДУ „КАМУНАР“ —НА ІНШЫЯ ЗАВОДЫ І ФАБРЫКІ

Культмасавую работу--на службу прамфінпляну

XVI зьезд нашай партыі даў ясныя і выразныя дырэктывы аб рашучай перабудове культ-масавай работы ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду. Як выконваюцца гэтыя дырэктывы, як саюзныя арганізацыі перабудавалі сваю культ-масавую работу клюбаў на прадпрыемстве пад лёзунгам «культ-масавая работа на службу прамфінпляну».

Тэмпы перабудовы надзвычай марудныя ў большасьці нашых арганізацый.

Праўда, мы маем некаторыя крупінкі ўдалага вопыту гэтай работы. НА ЗАВОДЗЕ «КАМУНАР» (МЕНСК) праз насьценгазэту, шматтыражкі, вытворчыя вечары, праз зьлёты ўдарных брыгад мясцовыя работнікі дабіліся вялікіх посьпехаў у галіне разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Дзякуючы ўдала наладжаным масавым формам работы, выпечыні хворую на рвацтва ўдарную брыгаду, якая выпусьціла 150 бракаваных варштатаў. Гэта брыгада, трапіўшы на дошку ілжаўдарнікаў, пад агонь самакрытыкі, зараз выпускае 500 варштатаў, бяз ніякага браку.

УГОМЕЛЬСКІМ «ПАЛЕСДРУКУ» мы маем удалы вопыт правядзеньня вытворчых мэнэўраў. Гэты вопыт МЕНСКІ КЛЮБ ДРУКАРОЎ падхапіў, перанёс яго на прадпрыемствы. У клюбе вы знойдзеце дошкі прагульшчыкаў, «ганебныя слупы», «табурэтні», выстаўкі «шкоднікаў вытворчасьці», рвачоў і лятуноў. Клюб наладжвае сыстэматычныя вытворчыя цэхавыя вечары, паходы з пражэктарам да кватэр злосных прагульшчыкаў, арганізуе брыгады з жонак рабочых па барацьбе з прагульшчыкамі і п'яніцамі.

Але-ж побач з гэтымі новымі формамі масавай культ-работы мы назіраем у большасьці клюбаў згідненькую бязьдзейнасьць, апалітычнасьць.

Прыгожыя, нядаўна пабудаваныя КЛЮБЫ ХАРЧАВІКОЎ І МЭТАЛІСТАЎ толькі і займаюцца тым, што «круцяць кіношку». Гэтыя клюбы не арганізуюць масы рабочых на барацьбу за выкананьне прамфінпляну, гэтыя клюбы далёка ад чарговых папітычных, гаспадарчых і культурных задач дня.

У Гомелі мы маем клюб мэталістаў. Побач з ім вялікі завод «Пралетарый». Зайдзеце ў клюб, і вы знойдзеце пакрытыя пылам і павуціньнем партрэты Ільліча, пустыя паўкі і больш нічога.

ЦП ХЭМІКАЎ БЕЛАРУСІ «ПРЫНЦЫПОВА СУПРОЦЬ КУЛЬТПАЛІТСАВЕТАЎ» — БАЯВЫХ ОРГАНАЎ МАСАВАЙ КУЛЬТРАБОТЫ. ЦП хэмікаў апартуністычна недаацэньвае значэньня гэтай работы. Яму няма справы да таго, што пад носам у яго на гуце «Пралетары» (Менск) разьвіта п'янства, карцёжная гульня, адсутнічае ўсякая культмасавая выхаваўчая работа.

ТАКАЯ АПАРТУНІСТЫЧНАЯ НЕДАЦЭНКА ЗНАЧЭНЬНЯ КУЛЬТ-МАСАВАЙ РАБОТЫ СЯРОД ЧЛЕНАЎ САЮЗУ З БОКУ ВЯЛІКАЙ КОЛЬКАСЬЦІ ПАРТЫЙНЫХ І ПРАФСАЮЗНЫХ АРГНІЗАЦЫЙ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АСНОЎНАЙ ПРЫЧЫНАЙ ТЫХ ЧАРАПАШЫХ ТЭМПАЎ, ЯКІЯ МЫ МАЕМ У ПЕРАБУДОВЕ РАБОТЫ НАШЫХ КУЛЬТ-АСЬВЕТНЫХ УСТАНОЎ. Нельга прайсьці міма таго, што бюро многіх партыйных ячэек рэдка заслухоўваць справаздачы кіраўнікоў клюбаў, арганізатараў культмасавай работы на прадпрыемствах. Нельга прайсьці міма таго, што праўленьні саюзаў, фабкомы, мясцкомы і па сёнешні дзень зводзяць культ-масавую работу ў сьцянах клюбу толькі да арганізацыі кіно, драмгурткоў, аркестраў.

А адсюль усе якасьці. Адсюль вылучэньне на культ-масавую работу «абы кага». Адсюль пастаянныя перакідваньні гэтых работнікаў з аднэй работы на другую, адсутнасьць усякай работы па падрыхтоўцы кадраў для культ-масавай работы.

АПАРТУНІСТЫЧНЫМ АДНОСІНАМ ДА ВАЖНЕЙШАЙ ГАЛІНЫ НАШАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА ТРЭБА ДАЦЬ РАШУЧЫ БОЙ. Культэстафэта, якая праводзіцца зараз, павінна даць пералом у бок хутчэйшага ажыцьцяўленьня партыйных пастаноў у галіне перабудовы культ-масавай работы тварам да вытворчасьці.

Нашым кіруючым прафорганам трэба прасачыць, праверыць, як уключыліся ў правядзеньне культэстафэты нашы фабрыкі і заводы. На аснове правядзеньня культэстафэты трэба неадкладна правесьці ў рэспубліканскім маштабе рад кароткіх зьлётаў арганізатараў масавікоў, культарганізатараў клюбаў, старшынь культпалітсаветаў, рабкораў насьценгазэт і шматтыражак.

Неабходна арганізаваць кароткатэрміновыя курсы для культмасавых работнікаў, завочныя кансультацыі, завочную перападрыхтоўку.

Пастановы XVI партыйнага зьезду павінны быць выкананы.

Б—с.

За карэнную перабудову

На сёнешні дзень культ-масавая работа далёка не на ўсіх нашых прадпрыемствах сапраўды пастаўлена на службу прамфінпляну.

Матар'ялы з месц сьведчаць аб тым, што некаторыя партарганізацыі і фабзаўкомы недаацэньваюць важнасьці і неабходнасьці рашучага павароту культработы тварам да вытворчасьці.

Ва многіх месцах у заняпадзе клюбы. Лёзунг: «Клюб. — цэх прадпрыемства», над якім праводзіліся ў мінулым месяцы ўсебеларуская клюбная нарада, слаба ажыцьцяўляецца на практыцы.

Возьмем, напрыклад, Віцебчыну. Там на ігопкавай фабрыцы культ-масавая работа да гэтага часу ніяк не наладзіцца. Пляну культработы няма, культсэктар зусім не працуе. На фабрыцы няма чырвонага куга. Бібліятэка не забясьпечана адпаведнай літаратурай.

Кіруючыя арганізацыі фабрыкі ганебна праспалі важнейшую галіну сваёй работы. Справа дайшла да таго, што рабочая брыгада, вылучаная на правядзеньні культэстафэты, лічыць неабходным зрабіць грамадзка-наказальны суд над вінаватымі ў зрыве культ-масавай работы на фабрыцы.

У клюбе фабрыкі «Дазьвіна» пельга знайсьці матар'ялаў аб ходзе выкананьня прамфінпляну. Канкрэтныя посьпехі ала ня ўзяты клюбам над аб'ектам самакрытыкі. Барацьба з прагульшчыкамі, лытунамі, лодырамі, змаганьне за тэмпы, за якасьць — мінаюць клюб. Пры клюбе няма гуртку. На фабрыцы — 200 рабочых, а бібліятэка налічвае ўсяго 60 чытачоў.

У Полацку на чыгунцы выдаецца вузкавая насьценгазэта і 3 цэхавых. Газэты не мабілізаваны на барацьбу за прамфінплян. Мяса рабочых у іх ня прыняе ўдзелу. Партыйнага кіраўніцтва газэтамі няма.

Камсамольская арганізацыя чыгункі, замест паглыбленьня культ-масавай работы сярод рабочых захоплена танцуль-камі.

У двух чыгуначных клюбах дэманструюцца чужыя нам нікодныя кінофільмы.

Асабліва яркіна абсалютуюцца пяныя зьмены. На полацкім лесазаводзе прадстаўнікі партячэйкі і заўкому зусім не наведваюць пачных зьмен. Ні газэт, ні часопісаў для пачных рабочых не пакідаецца.

Прыведзеныя факты сьведчаць аб тым, што з поля ўвагі найсобных партарганізацый выпадаюць бачныя пытаньні культ-масавай работы на прадпрыемствах...

Набліжаецца фініш усебеларускай культэстафэты. Трэба памятаць, што культ-масавая работа на прадпрыемстве — важнейшы маршрут яе.

Трэба ўзьняць яе на значна больную вышыню, пастаўць яе цалкам на службу прамфінпляну.

Юр.

Камэрсанты з культ-аддзелу ЦСПСБ

Гомельскі чыгуначны клюб Леніна, які абслугоўвае 6.000-ную армію чыгуначнікаў, выпрашу даць 100-процантную на якасьці пастаноўку. Спыніліся на п'есе Бязьменскага «Выстрел». Але як быць? Патрэбна, каб гэта п'еса была на беларускай мове. Перакладу гэтай п'есы на кніжным рынку няма. Але ўсім добра вядома, што тэатр-студыя ЦСПСБ ставіць гэту п'есу на беларускай мове. Пастаналі зьвярнуцца ў культаддзел ЦСПСБ. Але сакратар культаддзелу адказаў:

— Перакладу п'есы вам ня дам, бо тэатр-студыя — наша камэрцыйнае прадпрыемства. Тады ня будзе дзеля чаго пасылаць гэты тэатр у Гомель. Ды агрэмся таго ў вас ні хопіць сіл.

— Але што-ж рабіць? Гэтым вы прымушаеце ставіць п'есу на расійскай мове?

— Нічога падобнага. На расійскай мове я вам катэгарычна забараню ставіць гэту п'есу. Мы вас узгрэем пра пленум ЦСПСБ за гэта.

І ўсё. Гутарка скончана.

Для культаддзелу камэрцыйныя інтарэсы ЦСПСБ вышэй ідэйных інтарэсаў. Кто пяверне культаддзелам тварам да работных клюбаў і прымусіць яго адмовіцца ад «абароны ды лічэ такіх спэкабам, камэрцыйных (?) інтарэсаў культаддзелу ЦСПСБ.

Л. Сасімовіч.

ПАЧНЕМ АГЛЯД

СУТАВАРЫСТВА І РАБОЧАГА ШЭФСТВА

ШЭФСТВА РАБОЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ НАД ЧАСЬЦЯМІ—МАГУТНЫ СРОДАК УЗМАЦНЕНЬНЯ ПРАЛЕТАРСКАГА ЎПЛЫВУ НА ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ

Вайскова - шэфскую работу--на новыя рэйкі

Два гады таму назад праходзіла кампанія загляду чырвонай казармы».

Гэта кампанія ўзварушыла шырокія рабочыя масы. Цэлымі цэхамі і заводамі ішлі рабочыя ў чырвоныя казармы і практычна дапамагалі чырвонаармейцам паляпшаць іх быт. Сотнямі суботнікаў, тысячамі адпрацаваных дзён рабочыя масы далі сотні тысяч рублёў у карысьць Чырвонай армі.

За апошні час мы назіраем значнае аслабленьне гэтай работы ў той час, калі перажываны шырэйш узмацненьня ваеннай небясьпекі супроць СССР настойліва патрабуе ўзмацненьня сувязі з рабочай клясай, а шырэйш тэхнічнай рэканструкцыі патрабуе і ўзмацненьня пралетарскага ўплыву на Чырвоную армію. Рабочае шэфства над часьцямі мае для нас асабліва важнае палітычнае значэньне.

На любым заводзе нагавароце з рабочымі і вы ўбачыце, што яны пралуўляюць жывы інтарэс да таго, як жыве і працуе наш чырвонаармеец. Але рабочыя вельмі мала, а часамі і зусім ня ведаюць аб тым, як жыве іх шэфская часьць, як ідзе баявая падрыхтоўка, як працуюць партыйныя і камсамольскія арганізацыі.

Такасама аслабла работа і паўсутаварыстве. У практыцы работы мы мелі сумесныя агульныя сходы грамадзянскіх, партыйных і камсамольскіх ячэек з пастаноўкай у парадку дня раду агульных палітычных пытаньняў, наладжаны не вечарох, заключэньне дагавораў з абодвух бакоў на сацыялістычным спаборніцтве і г. д.

У некаторых часьцях мы маем рад дадатніх бакоў у шэфскай работе. Былі арганізаваны чырвонаармейскія брыгады, якія дапамагалі рабочым у выяўленьні ўнутраных рэсурсаў, у мабілізацыі сродкаў. Чырвонаармейскія часьці бралі на буксір прадпрыемствы, якія ня выконваюць прамфінпляну. У часе заключэньня сацдагавораў паміж часьцямі і прадпрыемствамі дабівалася значнага ўзьдыму энтузіязму ў рабочых і чырвонаармейцаў і ды надзяленьні вынікаў сацспаборніцтва і часьці і шэфствуючыя прадпрыемствы прыходзілі да фінішу з дасягненьнямі.

Але ёсьць і такія факты, што палкі і заводы забываюцца пра заключаны сацыялістычны дагавор. Пункты гэтага дагавору не даводзіліся да варштату, да рабочага, да чырвонаармейца. Ніхто не пацікаўляўся праверыць, як выкананы гэтыя дагаворы.

Агляд шэфскай работы, які начынаецца на БССР, павінен узварушыць усе пашы партыйныя і грамадзкія арганізацыі, асабліва прафсаюзы, фабрыкі і заводы, цэхі і агрэгаты з тым, каб дасьпяльна праверыць стан шэфскай работы, прыцягнуць шырокую рабочую грамадзкасьць да праверкі гэтай работы і на падставе вывадаў прыступіць да сапраўднай перабудовы шэфскай і сутаварыскай работы.

М.

Да ўсіх працоўных, да ўсіх членаў Асоавіяхіму БССР

ТАВАРЫШЫ!

СССР уступіў у трэці рашаючы год пяцігодкі — год завяршэньня набудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі.

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) у сваіх пастановах даў установы і асноўныя лічбы росту народнай гаспадаркі СССР. Кантрольныя лічбамі прадугледжаны высокія тэмпы росту прамысловасьці і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Савецкая Беларусь разам з іншымі брацкімі рэспублікамі Саюзу мае значныя посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве. Праведзены ў Маскве «тыдзень Савецкай Беларусі» выразна паказаў дасягненьні БССР; уздым эканомікі, быту і культуры пралетарскай на зямельнае і нацыянальнай па форме, прадэманстраваў непарыўнае адзінства і алучанасьць інтарэсаў працоўных БССР з усімі працоўнымі Савецкага Саюзу.

Побач з усё большым разгортваньнем сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, разгортваецца крызіс у капіталістычных краінах, расьце беспрацоўе, голад і галеча працоўных, расьце ўзбраеньне і падрыхтоўваецца інтэрвэнцыя з боку імпэрыялістаў супроць СССР. Вязьмуна шалёная падрыхтоўка імпэрыялістаў на чале з Францыяй, да вайны супроць СССР, новыя гастролі белагвардзейскіх генэралаў на ахлядзе сваіх узброеных сіл на Балканах, яўсім адкрытыя заявы белагвардзейскага генэрала Мідзера аб гатоўнасьці яго белай армії ўступіць у бойку з Чырвонай арміяй на маскоўскіх раўнінах, правакацыйнае выступленьне прафэсара Вілінскага унівэрсытэту. Ліманоўскага, яго адкрыты заклік да ўзброенага нападу на СССР — з усёй яркасьцю паказваюць рост пагрозы вайны супроць нас, патрабуюць ад нас кожны дзень узмацняць абароназдольнасьць СССР, быць гатовымі да адпору ворагу.

Узмацненьне баяздольнасьці Чырвонай армії, яе тэхнічнае «оснащение», узмацненьне марскага флёту — важнейшыя ўмовы нашай абароназдольнасьці. Адным з магутных сродкаў абароны зьяўляецца навітраны флёт. Мы маем значныя посьпехі ў галіне разьвіцьця нашай авіяцыі, але-ж мы вельмі і вельмі адсталі ў галіне навітра-плаваньня-дырыжаблябудаўніцтва.

Да гэтага часу мы не маглі вылучыць патрэбных сродкаў на навітраплаваньне, у прыватнасьці на дырыжаблябудаўніцтва.

Савецкая грамадзкасьць вяўсёды чула адклікалася на мерапрыемствы на ўзмацненьні абароны СССР. Аб гэтым сьведчаць набудаваныя эскадрыльі у адказ на ультыматумы Керзона, такі і самалёты — на ноту Чэмбэрлена і у адказ нане рымскаму і г. д.

Пад упливам прыкладу німецкага дырыжабля «граф Цэпэлін» у Маскву у 1930 г., працоўныя чырвонай сталіцы ініцыулі заклік «Набудуем моцны савецкія дырыжаблі». Гэты заклік знайшоў водгук сярод працоўных усяго Савецкага Саюзу. Працоўныя у сучасны момант шляхам узносаў і адлічэньняў далі ў «фонд дырыжаблябудаўніцтва» звыш 4.000.000 руб.

Што нам дадуць плянэрныя караблі? Пры дапамозе дырыжабляў мы зможам кутка зьвязацца з далёкімі акраінамі СССР (Сібір, Далёкі Ўсход, далёкія паўночныя краіны СССР, Туркестан), мы зможам у самыя далёкія куткі Савецкага Саюзу перадаваць необходныя грузы для ўздыму культуры для сад. будаўніцтва. Мы зможам весьці барацьбу з саранчой і інш. шкодникамі лясоў і палёў.

Дырыжаблі змогуць у патрэбны час ахоўваць нашыя морскія граніцы, разведваць ворага на моры, знаходзіць і зьнішчаць варожыя надводныя лодкі.

Усё гэта гаворыць аб необходнасьці набудовы буйных дырыжабляў.

Вырашэньне праблемы дырыжаблябудаўніцтва патрабуе вялікай работы на зямным абсталяваньні, падрыхтоўкі кадраў, вучабных і вопытных дырыжабляў і наогул стварэньня дырыжабельнай прамысловасьці.

З мэтай пашырэньня збору сродкаў у «фонд дырыжаблябудаўніцтва» Асоавіяхімам праводзіцца па Саюзе «Дзень дырыжабля».

На БССР «Дзень дырыжабля» праводзіцца 20 студзеня.

У гэты «дзень» усе працоўныя БССР пазнаюць прынцыпы актыўнага ўдзелу у кампаніі і сваімі ўзносамі і адлічэньнямі ўзмацніць «фонд дырыжаблябудаўніцтва».

Кожны працоўны, кожны член Асоавіяхіму, кожная ячэйка павінны ў гэты «дзень» яшчэ больш завастрыць увагу на ваеннай набясьпецы, на падрыхтоўцы да новага нападу на Савецкі Саюз з боку капіталістычных акул, завастрыць увагу на яшчэ большым згуртаваньні ўсіх сіл вокал камуністычнай партыі, на выкананьне і перавыкананьне праграм 3 году пяцігодкі, як заруки далейшага ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР.

Кожная ячэйка Асоавіяхіму, кожны яе член, усе працоўныя павінны дапамагчы разгарнуць і нашае савецкае буйное дырыжаблябудаўніцтва і як можна больш сабраць на гэта сродкаў.

Прыложым сілы, каб набудаваць буйныя савецкія дырыжаблі, ня ўзнуцы з гаспадарчага бюджэту сродкаў.

Наш актыўны ўдзел, нашыя добраахвотныя ўзносы дадуць магчымасьць разгарнуць набудову дырыжабляў.

Дамо новыя мільёны сродкаў на набудову буйных савецкіх дырыжабляў.

ЦС АСОАВІЯХІМУ БССР.

БДТ 2--НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ

Прыкладам для ўсіх арганізацый, якія зьяўляюцца культурнымі шэфамі Чырвонай армії, базумоўна, можа быць 2-гі Беларускі Дзяржаўны Тэатр.

Свае сувязі з падшэфным Стаўропальскім палком капэкты артыстаў і работнікаў тэатру замацаваў шляхам частых наведваньняў казарм палка і запрашэньня на свае вечары чырвонаармейцаў.

Дзякуючы намаганьням работнікаў тэатру, у палку працуе чырвонаармейскі тэатральны ансамбль, які добра пастаўлены сыграную гісторыю палка.

На свае пастаноўкі работнікі тэатру ў першыя-ж дні запрашаюць свой падшэфны полк. У тэатры надрэнна працуюць вайсковы гурток, якімі кіравалі камандзіры з палка.

Але на гэтых посьпехах работнікі тэатру ня спыніліся. Сваю пастаноўку «1-й конная» капэктыў артыстаў паказаў усяму гарнізону.

Калектыў працаваў і працуе з вялізарнейшай напружанасьцю і кожны выходны дзень выкарыстоўваў для таго, каб даць магчымасьць усім чырвонаармейцам гарнізону паглядзець «1-ю конную».

Бяз выходных дзён, без адпачынку працав

Па Савецкай Беларусі

ПАРАДНЫЯ РЭЗАЛЮЦЫІ ЗАМЕСТ ПРАКТЫЧНАЙ РАБОТЫ

Калгасы Чачэвіцкага раёну—у баку ад лесазагатовак

4-га студзеня калгасьнікі Бялыніцкага раёну абвясьцілі слабе ўдарнікамі на выкананьні плану загатовак і вывазкі лесу і выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва калгасьнікаў Чачэвіцкага раёну. Нарада старшынь калгасаў Чачэвіцкага раёну прыняла выклік і абяцала разгарнуць работу па выкананьні сандагавору.

Адпак, да гэтага часу калгасы Чачэвіцкага раёну па ўключыліся ў лесазагатоўкі. Пануль што праўленьні калгасаў займаюцца толькі вынясеньнем парадных рэзалюцый, а практычнай работы на відаць. Калгасы «Кастрычнік» (Чырвонскі сельсавет), «Чырвоны ўсход», камуна «Карла Маркса» (Грабавецкі сельсавет) і іншыя да гэтага часу не паспалі на лесазагатоўкі ніводнага лесаруба і возчыка.

Калгасакцыя Чачэвіцкага раёну не вядзе растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў аб важнасьці лесазагатовак. Выпучаная брыгада па праверцы выкананьня сандагавору нават не зьявілася ў Бялыніцкі раён.

У той-жа час калгасьнікі Бялыніцкага раёну разгарнулі шырокую практычную дапамогу лесазагатоўкам. Калгас «Іскра» (Ланькаўскі сельсавет) замест 7 коняй у дзень, вызначаных у дагаворы, пасылае на лесазагатоўкі 20 коняй; калгасы «Чырвоны гаспадар» і «Чырвоны Кастрычнік» (Вялерскі сельсавет), «Кастусь Каліноўскі» (Аляксандраўскі сельсавет), «Каменка» (Ланеўскі сельсавет), імя XVI зьезду УсеКП(б) (Запольскі сельсавет) і іншыя адразу ўзяліся за ліквідацыю прарыву ў лесазагатоўках. Калгасьнікі выкарыстаді для гэтай мэты час калядных сьвят.

Калгасная сыстэма Чачэвіцкага раёну павінна зараз-жа выправіць недахоп і неадкладна ўключыцца ў практычную работу. Сацыялістычны дагавор паміж бялыніцкім і чачэвіцкімі калгасамі павінен быць выканан абодвума бакамі.

Брыгадзіры бялыніцкіх калгасьнікаў
ТКАЧОЎ, ШЭНТАРАЎ.

Гаспадарка без гаспадара

БЕЛРЫБА ДРЭННА КІРУЕ СЬЛЯПЯНСКАЙ РЫБНАЙ СТАНЦЫЯЙ

У в. Сьляпянка (7 клм. ад Менску) знаходзіцца гаспадарка Белрыбы.

У часе будаўніцтва гэтай гаспадаркі дапушчана значнае выдаткаваньне матэрыялаў і нерацыянальнае выкарыстаньне сродкаў.

Гідратэхнік Траймовіч замест таго, каб арабіць дамбы ў 1 мэтр вышыні і тры мэтры шырыні, набудаваў 2-х-мэтровыя ў вышыню і 7-мэтровыя ў шырыню. Прыстасаваньне для спуску вады, якое паводле кашторысу павінна было каштаваць 80 руб., абышлося ў 500 руб.

У летніх сажалках, дзе вада павінна менш затрымлівацца, праблемы вялікія вады, а ў зімовых сажалках, дзе павінна быць шмат вады, — малыя. Шлюзы для спуску вады вельмі слабыя і ёсьць вагроза, што вясной яны разваляцца, бо ўжо зараз праз іх працякае вада.

У гаспадарцы панує нераспадарчасьць і безадказнасьць работнікаў. Рыба, якая павінна была быць вылаўлена з летняй сажалкі ў лістападзе, дагэтуль яшчэ ня вылаўлена. Нелавылаўлена 15 тысяч штук малькоў.

Сажалкі не ачышчаны ад водных расьлін, ад лёду і сьнегу, што выклікае сьмяротнасьць рыбы.

Белрыба ня прымае ніякіх мер для палепшэньня работы гаспадаркі. Допісы, вымешчаныя ў насьцэнгазэце, якія сьцьвярджвалі аб усіх гэтых прарывах, засталіся без рэагаваньня.

Далей такога становішча цярпець нельга. Белрыба павінна зацікавіцца гаспадаркай і пінаватых у бязьдзейнасьці і безгаспадарчасьці прыцягнуць да суровай адказнасьці.

«Лёгкія кавалерысты».

Кіраўніцтва спажыўтаварыства ня справілася з работай

БУДА-КАШАЛЁЎСКАЯ. (Наш кар.). Брыгада РКК РСІ абсьледавала работу Буда-Кашалёўскага спажывецкага таварыства. Брыгада выявіла амаль поўную бязьдзейнасьць праўленьня спажыўтаварыства, яно прыняло да рады прарываў у работе шомнята.

Спажыўтаварыства стаяла ў баку ад палітычна-гаспадарчых кампаній. Плясы загатовак і мабілізацыі сродкаў ня выкананы. Тавары з крам адпускаліся не па нормах, устаноўленых НКГанд'ю БССР, а па асобістых распаралжэньнях зог. гандлёвай часткі Краснэра.

Самейнасьць, сама-абесьпячэньне, заціск самакрытыкі — усё гэта ўкаранялася ў апарате спажыўтаварыства і тармазіла яго работу.

РКК РСІ зьняла з работы старшыню спажывецкага таварыства ЗАГАРОДНІКАВА і загадчыка гандлёвага аддзелу КРАСНЭРА. Прыняты меры да аздараўленьня апарату таварыства. Рад супрацоўнікаў прыцягваецца да судовай адказнасьці.

Брыгадзір РСІ.

Безгаспадарчасьць і непарадкі ў Ждановіцкім доме адпачынку

Камісія гаюўсцэнтраху БССР абсьледавала работу дому адпачынку ў Ждановічах. Камісія выкрыла рад ненармальнасьцяй.

У доме адпачынку пануе безгаспадарчасьць: увесь інвэнтар валяцца пад адкрытым небам, пажарны інвэнтар раскіданы па розных кутках.

Медычны нагляд і абсьлугоўваньне пакінуты дрэнна. Доктар Кліннікін вельмі рэдка адносіцца да адпачываючых. На скаргу аднаго адпачываючага, што ў матрацах завялися клапы, доктар адказаў: «Вас ня будзе, і клапоў ня будзе».

Культурна-асьветная работы як сярод адпачываючых, так і сярод абслугоўваючага персаналу не вядзецца. Мясцком амаль зусім не працуе. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута.

Камісія пастанавіла правесьці генэральную рэвізію работы дому адпачынку і перавучыць усёй маёмасьці.

Гарадзкой страхкасе даручана прыняць меры да аздараўленьня работы дому адпачынку.

Камісія пастанавіла зьняць з работы мэханіка Берозоўскага (справа аб ім перадана пракуратуры) і доктара Калініна.

Пашырыць сетку ясьляй

У Гомелі налічваецца каля 3.000 работніц. Ясьляй-жа ва ўсім горадзе — толькі 2. Гарадзкія арганізацыі ня прымаюць мер да павялічэньня сеткі ясьляй.

НІ АДЗІН ЖАКТ У ГОРАДЗЕ НЯ МАЕ СВАІХ ЯСЬЛЯЙ; ГАРЖЫЛСАЮЗ НЯ ПРЫМАЕ МЕР ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ ІХ. Гарсавет норміць абяцаньнямі, але нічога канкрэтнага ня робіць для пашырэньня ясьляй. Старшыня гарсавету перадаў памылканьне, прызначанае для ясьляй, у распараджэньне лясного інстытуту.

ГАЛЬПЕРЫНА.

З лістоў рабселькораў

Начсклад РСЧА—па-за ўвагай спажыўтаварыства

Ельскае спажыўтаварыства вельмі дрэнна абслугоўвае начальніцкі склад РСЧА, які знаходзіцца на тэрыторыі Каралінскага раёну. Паводле пастановы Белкаапсаюзу, работнікі райвайкамату павінны забясьпечваць чырвонаармейскім пайком. Гэта дырэктыва ігнаруецца старшынёю Ельскага спажыўтаварыства Кацубанскім. Згодна яго загаду тавары і прадукты выдаюцца вайсковым работнікам у апошнюю чаргу: былі нават выпадкі, калі работнікам райваенкамату выдаваліся пасаджаныя прадукты.

Праўленьне спажыўтаварыства павінна наладзіць рэгулярнае забесьпячэньне вайсковаслужачых.

Ваенны.

Уключыць Радзілавічы ў паштовую сетку

Вёска Радзілавічы (Тураўскі раён) чамусьці ня ўключана ў паштовую сетку. Лістаносцы і газэтаносцы вельмі рэдка зьяўляюцца ў вёску. Газэты дастаўляюцца толькі два разы ў месяц.

Загадчык Тураўскай пошты, перад якім многа раз ставілася пытаньне аб уключэньні вёскі ў паштовую сетку, нічога ў гэтым напрамку не зрабіў.

Між тым Радзілавічы — досыць вялікая вёска (174 гаспадаркі); у вёсцы ёсьць партыйная і камсамольская ячэйкі, хата-чытальня, каапэратыў, школа і калгас.

П.

Спыніць псаваньне паперы

На склады Белдзяржснабу часта прыбываюць рулоны паперы, амаль на-папову папсаваныя. Папера псуецца ў часе ўпакоўкі, нагрузкі, перавозкі і выгрузкі. Экспедытары паперы не зьвяртаюць ніякай увагі на гэты факт. Трэба прыняць тэрміновыя меры для спыненьня псаваньня паперы. Вінаватыя ў злачынных адносінах да перавозкі паперы павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

ПОЗЬНЯК.

Нлясавы вораг выключан з членаў саюзу

Рахункавод Віцебскай акулярнай фабрыкі Газэр, пад маскай савецкага служачага, праводзіў антысавецкую агітацыю сярод рабочых. Газэр заўляў, што «пяцігодка выконваецца за конт рабочай клясы», што партыя дрэнна адносіцца да спэцыялістаў» і г. д.

Рабочыя і служачыя фабрыкі далі рашучы адпор нагным выпадкам Газэра. Фабком выключыў Газэра з членаў саюзу і паставіў пытаньне перад адміністрацыяй аб зьняцьці яго з работы.

Р. Ц.

Белмэталаб'яднаньне ня выканала дагавору

У студзені 1930 г. Белкамунбанк выдаў Белмэталаб'яднаньню на пабудову ў Гомелі чатырохпавярховага дому для рабочых 180 тыс. рублёў. Паводле дагавору, Белмэталаб'яднаньне павінна было пабудаваць дом да 1-га лістапада 1930 г. між тым, пабудова дому ня скончана і да гэтага часу. У выніку рабочыя ня маюць магчымасьці своечасова атрымаць кватэр.

Белмэталаб'яднаньне павінна прыняць меры да хутчэйшага скончэньня пабудовы дому.

Д.

Палепшыць дастаўку газэт і лістоў

Аддзел дастаўкі Менскай пошты працуе вельмі дрэнна. Работнікі ў большасьці малапісьменныя і не кваліфікаваныя. Цікучасьць работнікаў вялікая. Прафарганізацыя зусім ня цікавіцца ўкамплектаваньнем аддзелу новымі работнікамі.

Між тым, скаргі на недастаўку газэт павялічваюцца. Трэба тэрміново ўкамплектаваць аддзел дастаўкі адданай кольскаю работнікаў. Акрамя таго, трэба паладзіць паасобную разнось газэт і лістоў. Гэта палепшыць дастаўку пошты.

РАЁННЫЯ ЗЬЕЗДЫ САВЕТАЎ

ВІТАЮЦЬ БАЯВЫ ШТАБ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА Ў БССР— БАЛЬШАВІЦКІ ЦК КП(б)Б

Пад знакам барацьбы за генэральную лінію партыі

СУРАЖ. (Па тэлегр.). Зьезд саветаў Сураскага раёну горача вітае баявы штаб сацыялістычнага будаўніцтва—ЦК КП(б)Б. Работа зьезду праходзіць пад знакам рашучай барацьбы са сканжэньнямі ленінскай лініі партыі, выкрыцьця ўсіх недахопаў у рабоце па перабудове сельскае гаспадаркі на сацыялістычны лад. Зьезд запэўнівае ЦК, што ўсе пытаньні, якія абгаварваюцца на зьезьдзе, будуць вырашаны ў адпаведнасьці з генэральнай лініяй партыі. Работа саветаў будзе падпарадкавана поўнасьцю ажыцьцяўленьню задач суцэльнае калектывізацыі і на гэтай падставе ліквідацыі кулацтва як класы.

Ажыцьцяўляем плян вялікіх работ

ЦЕРАХАВА. (Па тэлегр.). Другі зьезд саветаў Церахаўскага раёну шле гарачае прывітаньне кіраўніку сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР—бальшавіцкаму ЦК КП(б)Б. На падставе генэральнае лініі партыі, у рашучым змаганьні з правым і «левым» апартунізмам, пад кіраўніцтвам ЦК, ажыцьцяўляецца плян вялікіх работ—пяцігодка за чатыры гады. На запушчаных балотах нашае краіны вырастаюць гіганты-заводы, электрастанцыі, саўгасы калгасы—ачагі сацыялізму. Зьезд саветаў Церахоўшчыны запэўнівае ЦК, што ўсе пастаўленыя перад ім партыяй задачы будуць выкананы.

Баявому штабу сацыялістычнага будаўніцтва

ЛЁЗНА. (Па тэлеграфу). Лёзьненская раённая канфэрэнцыя жанчын-калгасьніц шчыра вітае баявы штаб сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР—ЦК КП(б)Б Канфэрэнцыя запэўняе ЦК, што пяны веснавой сяўбы ў раёне будуць поўнасьцю выкананы.

Прэзыдыум канфэрэнцыі.

Умацоўваем саветы—органы пралетарскай дыктатуры

VI раённы зьезд саветаў ДРЫБІНШЧЫНЫ шле шчырае прывітаньне ЦК КП(б)Б. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ЦК мы перанюжам усе труднасьці, што стаяць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, ажыцьцёвім задачы 1931 году і пяцігодку за чатыры гады.

У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі разгорнем далейшае наступленьне на капіталістычныя элемэнты па ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Рашуча змагаючыся з апартунізмам розных колераў, умацоўваючы органы пралетарскай дыктатуры—саветы, будзем упарта праводзіць у жыцьцё генэральную лінію партыі.

Няхай жыве правадыр і кіраўнік пралетарыяту і працоўных мас—ЦК УсеКП(б) і тав. СТАЛІН!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б!

Пад кіраўніцтвам партыі і яе ЦК—наперад да сацыялізму

ЛЕЛЬЧЫЦЫ. (Па тэлеграфу). VI зьезд саветаў Лельчыцкага раёну шле шчырае прывітаньне бальшавіцкаму ЦК КП(б)Б. Пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі і яе бальшавіцкага ЦК з посьпехам выканаем задачы, што стаяць перад намі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Калгасьнікі, беднякі і серадняк-адзіноасобнікі цесна згуртуюцца вакол камуністычнае партыі і мабілізуюць сябе на правядзеньне пастаўленых ёю задач.

Выканаем задачы 3-га рашаючага

ЧЫРВОНАПОЛЬЛЕ. (Па тэлеграфу). Шчырае прывітаньне кіраўніку і арганізатару сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР—ЦК КП(б)Б АД ШОСТАГА РАЁННАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ ЧЫРВОНАПОЛЬШЧЫНЫ. Зьезд запэўнівае ЦК, што ўся работа будзе выходзіць з пастанаў партыі пад знакам мабілізацыі актыўнасьці працоўных мас на выкананьне задач рашаючага году пяцігодкі.

На культурныя патрэбы

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону). Агульныя сходы бедняко ў і калгасьнікаў в. в. Навішча, Карсаковічы, Лісіна, Будзішча, Скуплина, Зародзішча і членаў калгасаў «Пралетарская перамога», «Чырвоны бацэ», імя Варашылава — Барысаўскага раёну, заслухаўшы даклад аб кантрольных лічбах трэцяга рашаючага году пяцігодкі, пастанавілі прасіць ЦВК СССР і БССР узмацніць мабілізацыю сродкаў, шляхам правядзеньня дадатковага абкладаньня на культурныя патрэбы краіны, выдаць у бліжэйшы час пастанову аб гэтым.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і савецкага ураду сумесна з рабочай клясай, беднякі, серадняк і калгасьнікі ідуць рашучы адпор вылазкам інтэрвэнтаў і іх агентуры і забясьпечань выкананьні пяцігодкі—за чатыры гады.

МЕНСК

„Дэкада барацьбы з аўта-аварыямі"

Цэнтральнае праўленьне Аўтадору БССР і ЦП саюзу транспартнікаў праводзіць з 10-га да 20-га лютага «дэкаду барацьбы з аварыямі аўтамабіляў і трактараў». На працягу «дэкады» ва ўсіх арганізацыях Аўтадору будзе праведзена шырокая растлумачальная работа аб правілах вулічнага руху, аб уважлівых адносінах да машын. Мяркуецца арганізаваць паказальныя суды над злоснымі псавальнікамі машын.

За дзень

— Прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук камандзіраваў двох пралетарыяк ў Кіеў на канфэрэнцыю па мовазнаўстве.

— Пры ЦСПСБ арганізавана бюро таварыства садзеяньня вынаходзтву. У склад бюро ўвайшлі т. т. Каменштэйн (старшыня), Русановіч, Плешаноў, Іперыёнаў і Дамброўскі.

— ЦСПСБ пастанаўлі паслаць рабочыя брыгады ў раёны для правядзеньня мясазагатовак. Гомельскаму гарпрафсавету прапанавана выдзеліць 15 брыгадзіраў, Мазырскаму—10, Бабруйскаму—14, Барысаўскаму—11.

ТУТ РУКА ШКОДНІКА

У апошні час пачалі часьцей назіравацца выпадкі злачынай работы транспарту і адпраўшчыкаў грузаў.

Надаўна рачыцкі завод «Інтэрнацыянал» атрымаў 2 бочкі бензыны, якія павінны быць накіраваны аўтатранспарту. Бочкі пралежалі на заводзе два месяцы, а за гэты час аўтобусы Рэчыцы стаялі два дні з-за недахвату бензыны.

Гэтымі днямі завод «Інтэрнацыянал» атрымаў 10 кажухоў, якіх ён ня выпісваў. Ёсьць думка, што гэтыя кажухі таксама адрасаваны аўтатранспарту.

На фабрыцы «Дніпро» атрымана 200 пар рукавіц, якія павінен быў атрымаць завод «Інтэрнацыянал». 100 пар рукавіц адміністрацыя «Дніпро» пасьпяшыла раздаць сваім рабочым.

І апошні выпадак, калі завод «Інтэрнацыянал» атрымаў 240 прасьцірадлаў, якіх ён ня выпісваў, а выпісаны груз пайшоў у Маскву.

Адпаведныя органы павінны зацікавіцца гэтым дзіўным вандраваньнем грузаў.

Рабкор заводу «Інтэрнацыянал»
ЛЕВІН.

Рэарганізацыя Менскай аб'яднанай прафшколы

Калегія НКА пастанавіла рэарганізаваць Менскую аб'яднаную прафшколу ў ІНДУСТРЫЯЛЬНА - ПЭДАГАГІЧНЫ ТЭХНІКУМ.

Тэхнікум будзе рыхтаваць інструктароў-выкладчыкаў для ФЗВ і камунальных сэмігодзін.

Тэрмін навучаньня ў тэхнікуме ўстаноўлен—3 гады.

Уносім і выклікаем

Слухачы курсаў НКФіну БССР уносяць на карысьць МОПР'у 60 руб. і выклікаюць пасьледаваць іх прыкладу слухачоў усіх курсаў гор. Менску.

Паведамленьні

— Культпроп ЦК КП(б)Б. 19 студзеня а 10 гадз. раніцы выклікаюцца ў культпроп ЦК КП(б)Б да тав. Рыўліна наступныя т.т. — члены фракцыі т-ва марксыстаў-эканамістаў: Лур'е, Аксельрод, Окур, Тамашэвіч, Айзенберг, Гурэло.

— Клюб камунальнікаў. Сёньня, 18 студзеня а 19 гадз. — агульны сход хатніх работніц мясцкому № 3. У парадку дня — справаздача гарсавету. Яўка ўсіх абавязкова.

— Дом Асьветы. 20-1 31 г., у 20 гадз.—урачысты сход навуковых працаўнікоў г. Менску, прысьвечаны гадавіне сьмерці Леніна. Уваход вольны.

— Клюб навуковых працаўнікоў. Навуковыя працаўнікі, у якіх ёсьць кнігі бібліятэкі клюбу, павінны здаць у 3-хдзенны тэрмін. Кнігі прымаюцца ў клюбе з 7—10 гадз. веч.

Сёньня, в 6 гадз. увечары, у малой залі ЦК КП(б)Б адбудзецца нарада камуністых-работнікаў цэнтральных газэт і рэдактароў раённых газэт.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная кантора
Менск, Савецкая, 83.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-90	Начны рэдактар	6-62
Сакратар	10-74	Галоўная кантора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		„ абвестак	7-81

Умовы падпіскі
(дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	1 р.
„ 3 мес.	3 „
„ 6 мес.	6 „
„ 12 мес.	12 „

Падпіска прымаецца ўсюды ва пошце.

Плата за абвесткі:
За радок вокл. пасьля тэксту—50 к., іншых гарадоў адпаведна—1 р. за радок. Пасьлядоўнасьцю—у два разы дарожэй. Пры спэцыяльным друкаваньні—скідка. Згодна тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-12—24 г. Операцыя 10 проц. падатку.

Абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газэты «ЗЬЯЗДА» Менск, Савецкая 83, 2-й паверх, тэл. 7-31.

18-га студзеня—нарада работнікаў цэнтральных і раённых газэт.

У НЯДЗЕЛЮ, 18-га СТУДЗЕНЯ 1931 году, роўна ў 6 гадзін вечара (з пралікам нарады і 13-га студзеня) у памяшканьні МАЛОЙ ЗАЛІ ЦК КП(б)Б

СЭКТАР ДРУКУ КУЛЬТПРОПУ ЦК КП(б)Б

скліча

ПАШЫРАНУЮ НАРАДУ

комуністаў-работнікаў цэнтральных газэт і рэдактароў усіх раённых газэт БССР

разам з партчасткай калегіі Наркамзему, Калгасцэнтру, Саўгасаюзу, Малочнага саюзу і Паляводсаюзу.

На нараду дня:

1) Уступнае слова сакратара ЦК КП(б)Б тав. Шкірятова.
2) Даклады т. т. Міцкова і Нурціна—калектывізацыя, масавая кампанія і друк.
3) Даклады рэдакцый газэт: «БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА» (даклад т. Шмідт судакл. ад сэктару друку тав. Вітліна), «МАЯК КАМУНЫ» (даклад т. Фаніна, судакл. ад сэктару друку т. Бэр) і «ПАЛЕСКАЯ ПРАЎДА» (даклад т. Давідовіча, судакл. ад сэктару друку т. Крайна)—аб пастаноўцы ў гэтых газэтах пытаньняў калектывізацыі, масавай кампаніі і аб падрыхтоўцы да Усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху.
4) Даклады аб спэцыялізацыі раённых газэт у сувязі з эканамічнымі асаблівасьцямі раёнаў.
5) Аб газэце «Рабселькор».
6) Бягучыя справы.

Рэдактары раённых газэт павінны прывезьці з сабой на нараду поўныя камплекты раённых газэт (з дня іх выхаду), а таксама ў двох экземплярах падрабязную пісьмовую справаздачу аб ходзе падрыхтоўкі ў раёне да Усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху.

Прыналежнасьць на нараду тавары́шам трэба зварачацца ка т. Мусінай (Культпроп ЦК КП(б)Б, пакой № 15).

Своечасовая яўка усіх, што выклікаюцца на нараду, абавязкова ў парадку партыйнай дысцыпліны.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр
Сёньня, 18 студзеня—спэктакль для саюзу будаўнікоў
„ПЕРШАЯ КОННАЯ"
Пачатак у 8 гадз. веч.

Беларускі Дзяржаўны вандроўны тэатр
пад кіраўніцтвам ГАПУБКА
абвяшчае ПРЫЁМ на ПАСАДЫ
акторaў і супрацоўнікаў
(МУЖЧЫН і ЖАНЧЫН)
Прыёмныя іспыты адбудуцца ў Доме Сялянина
25 студзеня 1931 г. у 12 г.
Да іспыту падрыхтаваць: верш, байку, сьпеў для тых хто сьпявае.
Необходны дзедзкі пра сацыяльнае становішча

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
1. ВОСТРАЎ БЕГЛЯКОЎ драма ў 6 частках.
2. Глядзі ў корань мікрофільтэм.
3. Заключны гукавы кіно-фільм ЧЭМПІЁНЫ ПЛАВАНЬНЯ
Пачатак 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура"
Лепшы фільм сэзону з эпохі грамадзянскай вайны
ТАБЕ ДАРУ
драма ў 6 разьдзелах.
Кіно-хроніка „Совкіно" № 64.
Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.
Каса—з 5 гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Шэсты фільм паводле вядомага апавяданьня Шолам-Аляйхема
ЯЎРЭЙСКІЯ ШЧАСЬЦЕ
— ЗЯШЫ ПРАГРАМЫ —
часьціць „Совкіно" № 63.
Пачатак 1-га сэзону—6 гадз.
Каса—з 4 гадз. 20 м.

КІНО „ГІАЛСТАРЫ"
Амэрыканскі прыгодніцкі фільм
ЧОРНЫ ЦЫКЛЁН
Пачатак: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса—з 4 з пал. гадз.

КІНО „ЮНЫ ПІЯНЭР"
Апошняя серыя
„ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯВАЛЯТА"
кіно-аповесьць у 6 част.
Пачатак: 1 гадз., 2 гадз. і 3 гадз. дня.
Каса адкрыта з 12 г. дня.

КІНО „ПАРТАК"
Зьяш праграмы гастроль арт. ленінгр. тэатру С. М. ВОЛЬКІНА — на экране —
ПАЛАЧЫ
ў 7 частках з пралёгам.
Пачатак 7 г., 9, 11 гадз.
Каса—з 5 гадзін.

ДОМ КАМУНІСТЫЧНАЕ АСЬВЕТЫ імя К. Маркса
19 студзеня, о 7 в пал. гадз.
адбудзецца
лекцыя тав. ПОТАША
„Нацыянальнае і калёніяльнае пытаньне ў пастаноўцы тав. Леніна".
Білеты па ячэйках і чытальні Дому.

СЕНЬНЯ, у 7 гадз. веч. ў Ленгабінэце Камвузу (Унівэрсытэцкая, 27)
адбудзецца
СХОД Т-ВА ГІСТОРЫКАЎ-МАРКСЫСТАЎ.
У ПАРАДКУ ДНЯ: Спрачкі па дакладу аб «Нашаніўскім перыядзе».
Запрашаюцца партыйны актыў, аспірانты і настаўнікі.

У ПАНЯДЗЕЛАК, 19-га студзеня ў 7 гадз. веч. у памяшканьні ЦК МОПР'у (Савецкая, 87)
адбудзецца
АГУЛЬНА-ГАРАДЗКАЯ НАРАДА актыву ўсіх ячэек МОПР'у.
З прычыны важнасьці пытаньняў, якія стаяць на нараду дня, яўка ўсіх старшынь, сакратароў і старшынь рэвіз. камісій абавязкова.
МЕН. ГАРКОМ МОПР'у.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА (Савецкая, 68)
Сёньня, 18 студзеня АДБУДЗЕЦЦА
УРАЧЫСТЫ СХОД,
прысьвечаны вынікам «Беларускага тыдню» ў Маскве.
У парадку дня:
I.
1. Даклад аб «беларускім тыдні».
2. Суаклады представуніцтва літаратурных арганізацый.
II.
Выступленьне: 1) пісьменьнікаў, 2) беларускай і яўрэйскай дзяржаўных капэлаў, 3) сінія блюзы клюбу мэталістаў і іншае.
Запрашаюцца рабочыя-ударнікі—делегаты «тыдню» ў Маскве, артысты, мастакі, кампазытары, беларуская і яўрэйская капэлі, ансамблі народных інструментаў, сінія блюзы клюбу мэталістаў і інш.
ПАЧАТАК а 7-й гадзіне ўвечары.
Праўленьне Дому Пісьменьніка.

УСЕБЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ
ГЭТЫМ ПАВЕДАМЛЯЕ,
што згодна пастановы СНК БССР ад III—31 г. (інд. 99-22),
усе ўстановы і прадпрыемствы абавязаны прадстаўляць свае КАСАВЫЯ ПЛЯНЫ
ў філіялы Дзяржбанку і райсельбанкі па прыналежнасьці кожнае 10-е прадпланіруемага месяцу.
У сувязі з тым, што да гэтага часу большасьць кліентаў азначаных пляноў не прадстаўлялі
УСЕБЕЛКАНТОРА
— паведамляе, —
што неатрыманьне гэтакіх да 18-га г. м. пацягне задавальненьне патрэб адпаведных кліентаў наяўнымі грашовымі знакамі ў апошнюю чаргу.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

БЕЛІЛЬНАСАЮЗУ
патрэбны для працы ў РЭСПУБЛІКАНСКІМ АПАРАЦЕ:
1 агранам - пляванік, 1 агранам-ільнавод 1 зоатэхнік, 2 раз'язных інструктары, 1 рацыяналізатар. Для працы ў райнах: аграномы, бухгальтары і рахункаводы. Уповы аплаты на згодзе. Зьвяртацца на адрэс: Менск, Белільнасаюз, Савецкая 46.
Праўленьне Белільнасаюзу.

Партрэт
мастацкі павялічаны з любой фат. карт. разьмер на паспарту 32-40 сант. 10 р. 75 к. з упак. і пер.
Адрас: „МОСКВА 2. почт. ящик 446, худож. маст. ГАГ".

Для здачы
АБВЕСТКІ
У ГАЗЭТУ
„ЗЬЯЗДА"
звяніце па тэл.
7-81

МЕНСКІ
фінансава-эканамічны тэхнікум
пры Наркамфіне БССР,
маючы мэтай падрыхтоўку інспэктарскага складу райфа і замесьнікаў загадчыкаў райбанкаў і загадчыкаў райначэйкас бухгальтароў і інш. спэцыялістаў фінансава-прадатчай сыстэмы,
АБВЯШЧАЕ,
што з 10 студзеня па 10 лютага праводзіцца
ПРЫЁМ ЗАЯЎ НА ПЕРШЫ КУРС.
Прымаюцца асобы ўзросту ня менш 16 год з асьвітай ня ніжэй курсу 7-годкі.
Да заяў прыкладаюцца: а) анкета па форме, устаноўленай для паступаючых у тэхнікум; б) дакумант аб асьвеце; в) дакумант аб сацыяльным становішчы і пахаджэньні (сяляне прадпадаткі; г) выпіска аб нараджэньні: д) медычная даведка аб стане здароўя. Скончыўшыя 7-годкі да 1929 году падлягаюць іспытам па наступных прадметах: грамадзязнаўстве матэматыцы і беларускай мове.
З агульнага ліку прынятых 50-60 проц. будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам.
Заявы і дакументы накіроўваць па адрасе: Менск, Наркамфін БССР, Фінансава-эканамічны тэхнікум.
ТЭРМІН НАВУЧАНЬНЯ 3 ГАДЫ.
Дырэктар тэхнікуму КАЗАКОЎ

Кошт публікацыі ЗА ЛІНІЯЮ 1 р. 1 дакуманту

Бюро ячэйкі КП(б)Б, мясцовы камітэт і супрацоўнікі СНКБ выказваюць свае глыбокае спачуваньне супрацоўніку СНК—тав. КУЗЬНЯЦОВУ з прычыны зьмерці яго
СЫНА

20 СТУДЗЕНЯ 1931 г.
АДБУДЗЕЦЦА
4-ы тыраж
ДЗЯРЖАЎНАЙ 9 % ВЫЙГРЫШНАЙ ПАЗЫКІ 1930 г.
У тыражы будзе разыграна:

1 выйгрыш	у 50000 руб.	на суму р.	50000
1 „	„ 25000	„ „ „ р.	25000
3 „	„ 10000	„ „ „ р.	30000
20 „	„ 1000	„ „ „ р.	20000

Разам 25 выйгрышаў на суму 125000 р.
Вольны продаж, пакупка і закład аблігацый
Аблігацыі прадаюцца ва ўсіх банках, ашчадкасах і крэдытных таварыствах.
Фондавы аддзел Дзяржбанку.

ПАПРАУКА
У абвестцы аб запрашэньні працаўнікоў у Інстытут Аховы працы пры ЦКП БССР, якая была зьмешчана ў газэтах: «Зьвязда» (№ 5 ад 6-I-1931 г.), «Рабочай» і «Савецкая Беларусь», памылкова надрукавана: «Лябаранты па хімічнай лябараторыі...». Замест «ЛЯБАРАНТЫ» трэба чытаць:
„Навуковыя працаўнікі".

АБВЕСТКІ
— 1 —
ПАВЕДАМЛЕНЬНІ ў чарговы нумар „Зьвязды"
прымаюцца толькі да 2-х гадзін дня.

У выпадку неакуратнага атрыманьня газэты
ЗВАНЕЦЕ
па тэлеф. № 15-42

Менск, друкарня «Зьвязды»

Менск, Гапонаўская № 337.